№№81–82
(2601–2602)

24 мая 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

ПАЛІТКУХНЯ

26 і 27 мая ў Палацы культуры Мінскага аўтамабільнага завода будзе праходзіць Кангрэс дэмакратычных сіл

Як паведаміў старшыня аргкамітэта па правядзенні Кангрэса Аляксандр Бухвостаў, *"ужо зарэгістравана каля 900 дэлегатаў і каля 150 запрошаных, яшчэ будуць і госці, і журналісты"*. Акрамя таго, дэлегатамі Кангрэса аўтаматычна становяцца тыя, хто за сваю палітычную дзейнасць быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Тыя, хто зараз знаходзіцца ў месцах зняволення, могуць перадаць свае паўнамоцтвы даверанай асобе.

У той жа час Палітсавет аб'яднаных дэмакратычных сіл вырашыў не рэгістраваць у якасці дэлегатаў Кангрэса VIP-персон. Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні Палітсавета. Спачатку хацелі па кожнай з амаль 200 VIP-персон галасаваць паасобку. Але Партыя БНФ выступіла за тое, каб даць статус дэлегатаў усяму спісу. Партыя камуністаў Беларуская, наадварот, выступіла супраць усіх, прапанаваўшы зарэгістраваць іх у якасці гасцей. *"Паколькі рашэнне павінна прымацца кансенсусам, а ПКБ сваю пазіцыю не змяніла, то VIP-персоны дэлегатамі КДС не будуць, а будуць толькі гасцямі"*, — паведаміў Аляксандр Бухвостаў. Як патлумачыў сітуацыю старшыня АГП Анатоль Лябедзька, нейкім чынам у спіс VIP-персон трапілі людзі, прозвішчы якіх мала каму з членаў Палітсавета што-небудзь гаварылі. Таму і было вырашана не разбірацца, хто ёсць хто, а запрасіць усіх гэтых людзей у якасці гасцей.

Сяргей ПУЛЬША.

АНОНС!

Сцяжынкі жыцця Сержука Вітушкі



1 сакавіка 2007 года "Народная воля" надрукавала мемуары вядомага кнігавыдаўца і перакладчыка, грамадскага дзеяча Міхася Дубянецкага. Распавядаючы пра падзеі ў Беларусі 1980-х гадоў, ён ўзгадаў і **Сержука ВІТУШКУ** — маладзёжнага лідэра тых часоў, кіраўніка нефармальнага аб'яднання "Талака".

"А там, на самым лобным месцы, — занатаваў у сваім дзённіку Дубянецкі, — *любімец "нефармальнай" моладзі (і мой таксама), кіраўнік "Талакі", мілы Сяргей Вітушка. Ён увесь палае. Агонь бачыш у яго вялікіх блакітных вачах, на яго, як мне здалося, запалых шчоках. Ледзь улоўна адчуваеш напружанне ва ўсёй яго стройнай постаці. Але вонкава ён нібыта нават спакойны, хоць, слухаючы яго, асэнсоўваючы тое, што ён кажа, немагчыма ў гэта паверыць. Прама хлопец можа валодаць сабою! Ён з веданнем справы мілагучна расказаў гісторыю Верхняга горада. Адважна казаў пра метадычнае яго разбурэнне ў савецкі час, заклікаў стварыць масавы рух "Родны горад".*

"Пляц" аддзячыў самаахвярнаму юнаку гучнымі працяглымі воплескамі. Я б не прамяняў гэтага слаўнага юнака на ўсіх насельнікаў пяціпавярховага будынка ЦК ЛКСМБ, уключна з шасцю яго фюрэрчыкамі і мноствам унтэрфюрэрчыкаў. Сяргей — сапраўды лідэр свядомай беларускай моладзі. Тыя ж — падгалоскі закаранелых бюракратаў, дэспаты аморфнай, нацыянальна бясполай і безаблічнай казарменнай масы".

Мінула шмат гадоў. Журналіст "Народнай волі" адшукала Сержука Вітушку ў Вільнюсе, дзе ён зараз жыве.

Як склаўся лёс Сержука Вітушкі, праз якія выпрабаванні давялося яму прайсці, што ён думае пра дзень сённяшні, пра што марыць — чытайце на 4-й старонцы.

ПУЛЬС

Рашэнне прынята

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура на прэс-канферэнцыі паведаміў журналістам, што прынята прынцыповае рашэнне аб пабудове АЭС у Чавускім раёне, паблізу вёскі Красная Паляна. Гэта за 40 кіламетраў ад Магілёва.

Да дня абвяшчэння суверэнітэту

На сваім чарговым пасяджэнні Сойм Партыі БНФ прыняў рашэнне аб утварэнні арганізацыйнага камітэта па святкаванні дня Дэкларацыі аб суверэнітэце 27 ліпеня і запрасіць да ўдзелу ў ім прадстаўнікоў усіх дэмакратычных структур.

Сумны адлік

Паводле звестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, на 1 красавіка 2007 года колькасць насельніцтва Беларусі складала 9 млн 705,2 тыс. чалавек. У параўнанні з пачаткам года яна зменшылася на 9,3 тысячы.

Скарачэнне колькасці насельніцтва звязана з перавышэннем на 11 тыс. колькасці памерлых над народжанымі.

Чаму мы не багатыя?

Беларусы спажываюць газу ўдвая больш за еўрапейцаў. А электраэнергіі на аднаго жыхара нашай краіны таксама прыходзіцца больш, чым на еўрапейца, у 1,5 раза. Як растлумачыў на прэс-канферэнцыі першы намеснік міністра эканомікі Беларусі Пётр Жабко: "У Еўропе крыху іншыя тэхналогіі, іншы падыход да энергазахавання".

Прапіскі не будзе, але радавацца рана

Зараз разглядаецца праект дакументаў, датычных адмены інстытута прапіскі ў Беларусі. Пра гэта паведаміў журналістам начальнік Упраўлення па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама Мікалай Шэўчык.

Але радавацца рана. Па словах спадара Шэўчыка, замест прапіскі ў пашпарце *"будзе ставіцца адзнака аб месцы жыхарства"*. Больш за тое, начальнік упраўлення адзначыў, што *"пасля адмены інстытута прапіскі ў Беларусі будзе больш жорсткае пакаранне за парушэнне правілаў пражывання без рэгістрацыі"*. Паводле праекта, рэгістрацыя аднаго чалавека можа праводзіцца на 15 метрах агульнай плошчы кватэры, паведамляе "Інтэрфакс".

Аляксей Янушэўскі — у Чэхіі

Ужо дакладна вядома, што аднаго з абвінавачаных па справе незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" на судзе не будзе. **Аляксей ЯНУШЭЎСКІ** ўцёк з Беларусі ў Чэхію. З'ехаў ён яшчэ 24 красавіка — праз Расію, Украіну, Польшчу. Цяпер Аляксей жыве ў Празе ў бацькі, які там працуе. Праўда, ужо найбліжэйшым часам хлопцу давядзецца перасяліцца ў інтэрнат для ўцекачоў — гэта неабходная ўмова, каб атрымаць у Чэхіі прытулак. У выпадку, калі яго справа ў Беларусі скончыцца штрафам ці ўмоўным пакараннем, Янушэўскі збіраецца вярнуцца на Радзіму.

АТЫ-БАТЫ

«Мы никому не угрожаем, но...»

В эти дни в Минске можно увидеть военных в самой экзотической форме. В белорусской столице работает Международная выставка вооружения и военной техники "Milex-2007". Открывал "подиум в стиле милитари" лично госсекретарь Совета безопасности Виктор Шейман.

Вопреки обыкновению, Виктор Шейман, который обычно предпочитает помалкивать, выступил с речью. *"В нынешних условиях мирового терроризма актуальна проблема безопасности, и сегодняшний форум призван содействовать этому..."* Далее в том же духе: мы никому не угрожаем, но готовы и сами обороняться, и другим помогать...

Напомним, что по решению белорусского правительства "Milex" проходит раз в два года, а генеральным спонсором ее бессменно выступает ведущий белорусский экспортер вооружений компания "БелТехЭкспорт". Главный торговец белорусским оружием, председатель правления "БелТехЭкспорта" Владимир Пефтиев, на выставке, однако, не появился, что подогрело слухи о фактической эмиграции Пефтиева. Мы решили проверить слухи у представителей компании. Но ответ оказался туманным: *"Он — "человек на крыльях", летает по всему миру по делам компании..."*. Вот и понимай как хочешь.

Кстати, "БелТехЭкспорт" за долгие годы работы уже хорошо известен в определенных кругах. Тем не менее на выставке компания заняла внушительные площади, как бы подтверждая свой статус ведущего поставщика вооружений, благодаря которому Беларусь даже входила в десятку ведущих мировых экспортеров оружия.

Кстати, по информации устроителей, выставку изъявили желание посетить делегации из 43 стран. В VIP-день, день открытия, бросались в глаза делегации из стран Ближнего Востока и Средне-Азиатского региона. К примеру, военные из Сирии долго не отходили от нового образца беспилотного летательного аппарата "Стрех", разработанного УП "Минский авиаремонтный завод".

Основной интригой нынешней выставки являлось то, посетит ли ее президент Ирана г-н Ахмадинежад, который в это время находился с официальным визитом в Минске. Не посетил. Видимо, Иран и Беларусь еще не готовы столь публично решать вопросы поставок вооружений.

Галина ЕФИМОВА.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Раней асудзяць — раней пасадзяць?

Судовы працэс па справе пяці "маладафронтаўцаў" перанесены з 30 мая на 28 мая. Перанос тлумачыцца "судовай неабходнасцю".

Спачатку судовы працэс над пяцёркай маладых людзей, якія абвінавачваюцца ў дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі: **Дзмітрыем Федаруком, Барысам Гарэцкім, Насцяй Палажанка, Алегам Корбанам і Аляксеем Янушэўскім** прызначаўся на 30 мая. На мінулым тыдні іх пяцёх наведаў судовы выканаўца з міліцыянтам, якія ўручылі новыя позвы ў суд — на 28 мая. Судовы выканаўца патлумачыў перанос працэсу *"судовай неабходнасцю"*.

Такім чынам, судовы працэс над "маладафронтаўцамі" пачынаецца 28 мая ў 10 гадзін у судзе Савецкага раёна Мінска. Судзіць маладых людзей будзе Руслан Аніскевіч. "Пяцёрцы" пагражае да двух гадоў зняволення.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ТЕМА ДНЯ

Все на продажу,

или О том, какая связь между акциями «Белтрансгаза» и суверенитетом Беларуси

Вячеслав ОРГИШ,
доктор философских наук

Лиха беда начало. После долгих торгов, закулисного шантажа и публичных разборок Москва, наконец, вынудила Минск подписать на прошлой неделе документы, согласно которым "Газпром" приобретает в собственность акции "Белтрансгаза". Ровно половина важнейшего стратегического объекта народного хозяйства Беларуси переходит во владение российского капитала. Событие знаковое, однако белорусская общественность отреагировала на сделку (первую такого рода) вяло. А, на мой взгляд, напрасно.

Первая ласточка

Как известно, основу белорусской экономики, ее становой хребет образуют около десятка подобного масштаба предприятий. По мнению экспертов, тот, кто контролирует их активы, контролирует и суверенитет белорусского государства.

В этой связи, как бы позитивно казенная пропаганда ни оценивала российско-белорусские отношения, минимум один факт является настораживающим, заставляет задуматься о том, какое будущее ждет нас, если эти отношения продолжат развиваться в прежнем ключе? Уже сегодня степень российского финансово-экономического присутствия в Беларуси многие аналитики считают критически опасной. Из-за того, что нынешнее белорусское руководство в свое время отвергло проект диверсификации нефтегазового импорта, наша страна попала в полную энергетическую кабалу к восточной соседке. Это же руководство, отказавшись от либеральных реформ белорусской экономики, поставило отечественного производителя в одностороннюю зависимость от российского потребителя.

Сегодня перекрой Россия доступ к своим рынкам, закрой (или прикрой) нефтегазовый вентиль, и Беларусь будет вынуждена стоять на коленях. Собственно, ровно это и пробовал сделать "большой брат" в начале года (пока только в режиме сравнительно легкого шантажа), когда взвинтил цены на газ и нефть и угрожал прекращением их поставок. В сущности, за нефтегазовым конфликтом января 2007 года достаточно отчетливо просматривались и просматриваются имперские проекты соседнего государства. Российские олигархи, подцепив белорусский режим на короткий нефтегазовый поводок (прикормив его дешевыми энергоносителями и иными торговыми поблажками), теперь конкретно принялись прибирать к рукам лакомые куски белорусской экономики. "Белтрансгаз", по всей видимости, только первая ласточка. "Красный дом" долгое время изворачивался, однако, загнанный Кремлем в угол экономической нужды, все же сдался.

Схема действий российских стратегов проста и цинична. Пользуясь всесторонней экономической зависимостью Беларуси от России, зная, что у Минска нет окольных путей и отступать ему особенно некуда, Москва периодически поднимает вопрос о более "справедливом" ("рыночном") ценообразовании в торговле с белорусской стороной. Одновременно в качестве некоего компромисса Минску предлагается приобрести российские льготы в обмен на продажу российскому капиталу тех или иных предприятий белорусской экономики. Когда в конце прошлого года стала назревать российская нефтегазовая атака, российские чиновники вполне открыто формулировали условия гешефта (в том числе по продаже "Белтрансгаза"), выполнение которых эту атаку, как уверяли они, ослабит, сделает менее болезненной для белорусов. Упрямый Минск не внял, и тогда Россия взвинтила цены на газ и нефть, принялась душить некоторые виды белорусского экспорта. В результате белорусское экономическое "чудо" посыпалось. "Красный дом" запросил у Кремля полуторамиллиардный долларовый кредит (как было заявлено, для стабилизации экономической и социальной ситуации в стране). Переговоры на эту тему уперлись в продажу ... "Белтрансгаза". Москва не мытьем, так катаньем добилась своего.

В белорусском правительстве, вероятно, облегченно вздыхают — обещанный Россией полуторамиллиардный кредит хоть на время поможет решить возникшие после январского нефтегазового конфликта острые проблемы белорусской экономики. А в Кремле наверняка потирают руки — операция по приобретению финансово-экономической власти над Беларусью хоть и с трудом, но развивается. Кремлевские стратеги, вполне может быть, уже обдумывают план очередного приобретения стратегических объектов на территории братской Беларуси.

Стратегический вопрос будущего

Но почему, собственно, Россия не может инвестировать в белорусскую экономику путем покупки акций ее крупнейших предприятий? Так делается во всем мире. Свободные капиталы идут туда, где есть перспектива отдачи от их вложения. Зачем тревожиться по поводу того, что деньги российских олигархов будут работать в белорусской экономике?

Разумеется, в самом факте экспансии российских капиталов в белорусскую экономику трагедии нет. Тревожит иное. Стремление России стать монопольной владелицей стратегически важных промышленных активов Беларуси, за которыми угадывается желание определенных кругов России подмять белорусский суверенитет. Это первое, что заставляет бить тревогу. Несколько лет назад Анатолий Чубайс, идеолог либерального, если так можно выразиться, направления российского великодержавия, сформулировал доктрину, согласно которой России надлежит стать энергетической империей. В этом качестве она сможет контролировать своих сателлитов (в их числе и Беларусь) не силой оружия, а с помощью основанного на энергетических ресурсах российского капитала, экспорт которого должен стать доминирующим фактором распространения российского влияния и присутствия.

Второе. По-крупному, а не только по мелочам в белорусскую экономику пока рвется, и реально прорывается, лишь российский капитал, поскольку он опирается на одностороннее влияние России на Беларусь. Западный капитал пока не может на равных бороться с российскими корпорациями за инвестиционные объекты в Беларуси. И, соответственно, не может служить противовесом монопольным (имперским) устремлениям России в Беларуси. При существующем положении вещей Запад не может также противопоставить качество своих инвестиций качеству инвестиций из России. Между тем ни для кого не секрет, что западный капитал вооружен современными и весьма перспективными технологиями, эффективным менеджментом, чего не скажешь о капитале российского происхождения. Если перекос в пользу российских инвесторов в белорусскую экономику сохранится, Беларусь рискует быть непоправимо оторванной от европейского политического и производственно-технологического пути развития. Более того, ей грозит перспектива разделить историческую судьбу России, которая при близком рассмотрении отнюдь не выглядит безоблачной и обнадеживающей. Короче говоря, ограниченное (или, напротив, неограниченное) привлечение российских инвестиций в белорусскую экономку — это стратегический вопрос нашего будущего.

Белорусские правительственные чиновники уже говорят о подготовке к приватизации еще пятнадцати крупных объектов белорусской экономики. Надо латать зияющие дыры в белорусском бюджете, поэтому рано или поздно на продажу пойдет все.

На что рассчитывает белорусский режим в сложившейся ситуации? Похоже, на удачу, на то, что получится развязать экономические узлы, ничего принципиально не меняя в самой системе белорусской власти и ее стратегическом курсе. В "Красном доме", по всей видимости, очень надеются, что экономическая и политическая конъюнктура изменится в благоприятную сторону и Кремль удастся урезонить, то есть убедить его хозяев в том, что с верными союзниками надо обходиться мягче. Еще в "Красном доме" полагают, что планируемая перепродажа венесуэльской нефти, а также разработка иранских нефтяных полей (о чем, в частности, велись переговоры с президентом Ирака Махмудом Ахмадинежадом во время его визита на этой неделе в Беларусь) могут явить некую альтернативу российскому экспорту углеводородного сырья. Однако стратегические установки официального Минска, насколько можно судить по его реакциям, все еще остаются в границах прежних заблуждений.

А на что рассчитывает белорусская демократическая оппозиция. Судя по всему, также на пресловутое "авось". Во всяком случае, новая оппозиционная стратегия (ее планируется принять на Конгрессе объединенных демократических сил 26—27 мая) по поводу того, как сдержать тотальную экспансию российского капитала, ничего внятного не говорит. Как не говорит и о том, каким образом практически добиться баланса присутствия западного капитала в белорусской экономике, от которого принципиально зависит европейское будущее Беларуси. Быть может, пока не поздно (пока активы важнейших экономических объектов Беларуси не перешли в руки российских олигархов), творцам проекта новой стратегической доктрины ОДС не стоит торопиться с ее принятием на Конгрессе, а продолжить работу, сосредоточить усилия на концептуальных аспектах решения проблемы противодействия неограниченному вторжению российских денег в белорусскую экономику. По крайней мере, предстоящий Конгресс ОДС должен бы дать этому вопросу принципиальную оценку.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 МАЯ 2007 г.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Каладзішчанская вайна

выходзіць на новы віток

Няроўнае процістаянне Мінскага райвыканкама з Каладзішчанскім сельскім Саветам дэпутатаў працягваецца. Рэгіянальная вайна абяцае перарасці ў палітычны серыял найгоршага гатунку. Мінская вертыкаль "ламанула" праз калена 15 дэпутатаў сельсавета, а міжрайпракуратура не ўбачыла (ці не захацела бачыць) парушэнняў закона. Аднак вайна выходзіць на новы віток: цяпер справай мусіць заняцца Мінская абласная пракуратура.

Ліст да пракурора

Нагадаем храналогію процістаяння, тым больш што яна выкладзена ў звароце васьмі дэпутатаў Каладзішчанскага сельсавета Мінскаму міжрайпракурору Ігару Шкатуле.

13 сакавіка *"па вусным указанні старшыні Мінскага раённага Савета дэпутатаў Алены Меляшкевіч"* была склікана сесія Каладзішчанскага сельсавета, на якой мусілі абіраць старшыню. Пра сесію, прызначаную на 18 гадзін, дэпутаты даведаліся толькі раніцай 13 сакавіка. Хаця па рэгламенце дэпутатаў мусілі ўведаміць пра дату сесіі не пазней чым за сем дзён да яе правядзення.

Старшыня Мінскага райвыканкама Міхаіл Глінскі прапанаваў 15 дэпутатам абраць старшынёй Алега Іванько, хаця на дзвюх папярэдніх сесіях (2 лютага і 13 лютага) дэпутаты *"пракідвалі"* кандыдата ад *"вертыкалі"*. І гэтым разам з 15 дэпутатаў 9 прагаласавалі супраць абрання стаўленіка райвыканкама. Смелае рашэнне! Бо тры няўдалыя спробы правесці паўнацэнную сесію пагражалі роспускам сельсавета.

Аднак выканаўчая ўлада ў асобе Міхаіла Глінскага *"вырашыла і пастанавіла": "Дэпутаты будуць галасаваць столькі разоў і да таго часу, пакуль не будзе абраны старшынёй А.Л.Іванько, нягледзячы на тое, што гэта з'яўляецца прамым парушэннем парадку правядзення сесіі"*. Па крайняй меры менавіта так апісаны падзеі ў заяве пракурору.

Акрамя таго, восем дэпутатаў указалі на зафіксаваныя парушэнні заканадаўства.

У той памятны дзень — дзень галасавання — на знак пратэсту супраць ігнаравання рэгламенту сем дэпутатаў пакінулі сесію. У выніку засталіся 8 чалавек, што аўтаматычна *"робіць вынікі выбараў неправамоцнымі ў сувязі з адсутнасцю кваліфікаванай большасці выбраных дэпутатаў"*. "У сувязі з тым, што дзеючы рэгламент Каладзішчанскага сельскага Савета дэпутатаў не дазваляў правесці выбары старшыні той колькасцю дэпутатаў, якія засталіся на сесіі, васьмю дэпутатамі, пад ціскам старшыні Мінскага РВК М.А.Глінскага і старшыні Мінскага раённага Савета дэпутатаў А.А.Меляшкевіч было прынята рашэнне аб змяненні рэгламенту. Што з'яўляецца грубейшым парушэннем артыкула 32 рэгламента Каладзішчанскага сельскага Савета, згодна з якім пытанні, што датычацца змянення рэгламента, таксама прымаюцца 2/3 галасоў ад абраных дэпутатаў", ці не менш чым дзесяццю дэпутатамі.

Падпісанты дакумента звярнулі ўвагу пракурора на той факт, што раённыя чыноўнікі "груба парушылі ўказ прэзідэнта РБ №21 ад 12.01.2007 года, рэгламент Каладзішчанскага сельскага Савета дэпутатаў, артыкул 11 Закона РБ "Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў", артыкул 15 Закона РБ "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў РБ". На гэтай падставе восем дэпутатаў прасілі пракурора прызнаць сесію Каладзішчанскага сельсавета і прынятыя на ёй рашэнні незаконнымі і адмяніць іх.

«Без мяне мяне ажанілі»

А вертыкаль тым часам у шапку не спала. І актыўна дзейнічала. 3 мая экстранна склікаецца сесія Мінскага раённага Савета дэпутатаў, якая дае згоду на вызваленне Анатоля Бурачэўскага (менавіта яго, насуперак жаданню райвыканкама, большасць дэпутатаў жадала бачыць сваім старшынёй) ад займаемай пасады — намесніка старшыні Каладзішчанскага сельскага выканкама. *"Па гарачых слядах"* яўна дасведчаны чытач на форуме "Народнай волі" ў Інтэрнеце яшчэ 5 мая задаўся лагічным пытаннем: "А почему сессия Минского райсовета дала согласие на увольнение А.С.Бурачевского, а не, скажем, сессия Жодинского райсовета? Власть даже не удосужилась пригласить А.С.Бурачевского, чтобы заслушать. Неугодному человеку СИСТЕМЫ можно приписать все что угодно. Вообще ситуация уж больно похожа на спектакль "Без меня меня женили".

І сапраўды, Анатоль Бурачэўскі не мае ніякіх звестак (апрача, вядома, чутак) пра вынікі сесіі райсавета — дэпутата Каладзішчанскага сельскага Савета нават не запрасілі на сесію райсавета, дзе вырашалі ягоны лёс. *"Мінскі райсавет не мае права даваць згоду на маё звальненне — гэта мусіць рабіць той Савет, дэпутатам якога я з'яўляюся. Я з'яўляюся дэпутатам Каладзішчанскага сельскага Савета, сесія сельсавета пытанне аб маім звальненні не разглядала"*, — заявіў "Народнай волі" Анатоль Бурачэўскі.

Пытанне, што цікава, гучала ў дзіўнаватай пастаноўцы: маўляў, трэба даць згоду на звальненне Анатоля Бурачэўскага — і такім чынам падтрымаць Каладзішчанскі сельсавет, які нібыта прыняў адпаведнае рашэнне. Ці трэба казаць, што ніякага такога рашэння Каладзішчанскі сельсавет не прымаў...

13 сакавіка, калі палова дэпутатаў пакінула сесію сельсавета ў знак пратэсту супраць яўнага гвалту, арганізатары сесіі сапраўды спрабавалі вынесці пытанне пра А.Бурачэўскага на галасаванне. Аднак марна. Пазней райвыканкам спрабаваў склікаць спецыяльную сесію па Анатолю Бурачэўскаму — на сесію прыйшлі толькі пяцёра з пятнаццаці дэпутатаў. Што цікава: калі тройчы не ўдаецца склікаць сесію Савета, то яму пагражае роспуск. Таму лагічным стаў ціск на дэпутатаў: міліцыянераў, начальніка ЖБК, медсястру...

Судовы працэс па іску Анатоля Бурачэўскага да новага старшыні сельсавета Алега Іванько і Мінскага райвыканкама, пачаты 5 сакавіка, некалькі разоў пераносіўся. На момант падрыхтоўкі гэтага матэрыялу да друку наогул не прайшло ніякіх пасяджэнняў. *"Я чакаю, якія дакументы прынясуць на суд, каб патлумачыць маё звальненне"*, — кажа А.Бурачэўскі.

Плявок у твар

Пакуль зварот васьмі каладзішчанскіх дэпутатаў разглядаўся, Мінскі райвыканкам працягваў гнуць сваю лінію. Прычым не дужа зважаючы на закон. Хаця б такі прыклад: калі ўжо з'явілася думка прыбраць няўгоднага чыноўніка, то варта было б заручыцца згодай на звальненне чыноўніка ДА самога звальнення, а не праз тры месяцы ПАСЛЯ таго. Такі закон: добры ці дрэнны — але гэта закон.

А тым часам Мінскі міжрайпракурор Ігар Шкатула 19 красавіка даслаў дэпутатам адказ. Цікавы дакумент — як ні круці. *"Па выніках тайнага галасавання за кандыдатуру А.Л.Іванько прагаласавалі ўсе 8 прысутных дэпутатаў, што склала больш за палову ад 15 выбраных дэпутатаў Каладзішчанскага сельскага Савета. Пры такіх абставінах падстаў для прыняцця мер пракурорскага рэагавання не маецца"*.

А як жа сесія, якая, згодна з рэгламентам, наогул была неправамоцнай?..

Пытанне гэта так і павісла ў паветры, бо пагаварыць з аўтарамі ліста ў пракуратуры нават не палічылі патрэбным...

18 мая ўсё тыя ж восем дэпутатаў накіравалі заяву ў пракуратуру Мінскай вобласці. Дэпутаты спрабуюць давесці абласной пракуратуры, што спасылка раённага пракурора на супярэчнасць артыкула 40 рэгламента сельсавета артыкулу 20 Закона "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні" юрыдычна не абгрунтавана (не состоятельна)".

"З дэпутатаў робяць дурняў. Мы пішам заяву міжрайпракурору, а нам адказваюць словамі Меляшкевіч пра супярэчнасці. Трэба, каб пракурорскія работнікі хаця б прачыталі пратакол сесіі, а гэта не пратакол — гэта "запіскі вар'ята", нават па афармленні. І ўвогуле: 7 дэпутатаў пакідаюць сесію, а Меляшкевіч прапануе зрабіць сесію закрытай? Як гэта разумець? Дык трэба закрыць гэтую сесію, аб'явіць новую і зрабіць яе закрытай..." — кажа адзін з каладзішчанскіх дэпутатаў.

Яшчэ і яшчэ раз 8 дэпутатаў з 15 абраных спрабуюць дабіцца ад абласной пракуратуры праверкі на законнасць прынятых 13 сакавіка Каладзішчанскім сельсаветам рашэнняў. І пералічваюць спіс парушэнняў заканадаўства. Яны ўпэўнены: па выніках галасавання за кандыдатуру Алега Іванько прагаласавалі толькі 6 дэпутатаў, 9 — выказаліся супраць. Такім чынам, кадравае пытанне было вырашана, і вырашана адмоўна для выканкама, а пытанне пра паўторнае галасаванне па кандыдатуры старшыні сельсавета на галасаванне не выносілася.

"Процізаконны ціск з боку службовых асоб Мінскага раённага выканаўчага камітэта (М.А.Глінскі — старшыня Мінскага РВК, А.А.Меляшкевіч — старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў, В.Н.Маісееў — начальнік Мінскага РУУС), прысутных на сесіі Савета дэпутатаў 13 сакавіка, якое выразілася: у перашкодах разгляду іншых пытанняў, унесеных на парадак дня сесіі дэпутатаў і закрыцці сесіі; у патрабаваннях М.А.Глінскага аб правядзенні паўторнага галасавання за кандыдатуру А.Л.Іванько без выканання прадугледжанай рэгламентам сельскага Савета працэдуры".

Падпісанты просяць даць прававую ацэнку кіраўніцтву Мінскай вертыкалі і выклікаць іх для дачы паказанняў адносна сакавіцкай сесіі.

Дзве трэці дэпутатаў Каладзішчанскага сельсавета нема крычаць, што парушаны закон. А пракуратура, як сляпая Феміда з завязанымі вачыма, робіць выгляд, што нічога не бачыць, нічога не чуе.

Кампетэнтная думка

Яшчэ адзін дэпутат у гутарцы з карэспандэнтам "Народнай волі" пацвердзіў, што прычына канфлікту — зямля. Праўда, дэпутат пажадаў захаваць ананімнасць.

"Палігон, які раней належаў Міністэрству абароны, — адзіны ў рэспубліцы масіў забудовы, які, па-першае, мае такі маштаб, а па-другое, не выкарыстоўваецца на поўную моц, бо няма інфраструктуры. Безумоўна, будаўніцтва гольф-клуба азначае, што туды пойдуць сеткі, у першую чаргу вялікая падстанцыя, якая мусіць забяспечыць электрычнасцю ў тым ліку і катэджныя забудовы. Вельмі хутка цана на зямлю паднімецца, хаця цяпер там цана самая нізкая сярод падобных масіваў забудовы ў Мінскім раёне. І ўжо зараз цэны пачалі прыбліжацца да сярэдніх. Указ прэзідэнта пра канфіскацыю невыкарыстоўваемых зямельных участкаў прадугледжвае вызваленне невыкарыстоўваемых зямельных участкаў, бо ў Каладзішчанскім сельсавеце вельмі многа такіх. Паводле нядаўняга прэзідэнцкага ўказу, набыццё зямельных участкаў у прыватную ўласнасць падразумявае рост цэн на зямлю".

Генрых СТАХОЎСКІ,
Мінскі раён.



Конкурс у ліцэй БДУ — 5,5 чалавека на месца

Падведзены вынікі ўступнай кампаніі 2007 года ў ліцэй Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Як паведамляе прэс-служба БДУ, пры плане прыёму 240 чалавек было пададзена 1 тысяча 197 заяў на такія профілі навучання, як фізіка, матэматыка, хімія, біялогія, гісторыя, руская і беларуская філалогія.

Сярэдні конкурс у ліцэй склаў 5,5 чалавека на месца. Самымі папулярнымі аказаліся матэматычны (7,2 чалавека на месца) і філалагічны (7,8) профілі навучання. Набор у ліцэй БДУ ажыццяўляўся па выніках іспытаў. Без экзаменаў быў залічаны 21 вучань — пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.
Фота Леаніда ГАЦАКА.

МЕДДАВЕДКА

Больш за тысячу беларусаў памерла ад СНІДу

Трэці год у Беларусі рэалізуецца праграма "Прафілактыка і лячэнне ВІЧ/СНІД у Рэспубліцы Беларусь".

На дадзены праект, які разлічаны на 2004—2009 гады, Глабальны фонд выдзеліў нашай краіне 16,8 мільёна долараў. Атрымальнікам грошай з'яўляецца прадстаўніцтва ААН у Беларусі, а выканаўцам праекта — Міністэрства аховы здароўя. Сёння ў нашай краіне, згодна з афіцыйнай статыстыкай, жывуць 7935 носьбітаў ВІЧ, што складае 80,9 выпадку на 100.000 насельніцтва. У асноўным гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў.

1013 беларусаў ужо памерлі ад СНІДу. Большасць з іх — 750 чалавек — былі наркаманамі.

Па словах кіраўніка ПРААН у Беларусі **Джыхан СУЛТАНАГЛУ**, галоўная мэта праграмы — павысіць эфектыўнасць выяўлення і лячэння ВІЧ. І тут не апошнюю ролю павінны адыграць медыкі.

Сёння вынікі працы праекта такія: 638 ВІЧ-інфіцыраваных атрымалі комплекснае лячэнне, 219 цяжарных ВІЧ-інфіцыраванных жанчын прайшлі прафілактыку перадачы інфекцыі дзіцяці. За гэты ж час адкрыта 58 ананімных пунктаў для кансультацый нарказалежных беларусаў. Каля 15 тысяч чалавек ужо атрымалі там дапамогу. Працуюць праграмы прафілактыкі ВІЧ у ВНУ, школах. Ахоплены ўвагай і іншыя групы рызыкі.

Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні беларускіх медыкаў, маштаб захворвання расце. І справіцца з ім без дапамогі міжнародных структур вельмі цяжка.

Галіна ЯФІМАВА.

ПИСЬМО ПЕНСИОНЕРА

Я не прошу... Я требую!!!

Кухня не зовет, а уже выталкивает на площадь

Вкратце о себе. Пенсионер с восьмилетним стажем. Пенсия была назначена по возрасту. Стаж работы — около 42 лет. Индивидуальный коэффициент — 1.86.

Я требую:

1.Чтобы сержанты, офицеры, учителя, врачи, ИТР и другие получали свою, заработанную и достойную пенсию.

Известно, что сейчас пенсия учителей, врачей и ИТР унизительно мала и находится где-то на уровне пенсии сержантов, а то и ниже. Считаю, что пенсия у этой категории населения должна быть сопоставима с пенсией офицеров министерств обороны и внутренних дел, но ни в коем случае не с пенсией сержантов.

Возьмем, к примеру, пенсии офицеров Министерства обороны Республики Беларусь. Сейчас все служат и работают в пределах своей страны. Где и как они раньше служили, "воевали", это еще надо посмотреть. Но будем исходить из того, что они заслужили ту пенсию, которую получают.

У военного подполковника средняя пенсия превышает 600 тысяч рублей. У меня пенсия — 350 тысяч рублей. Получается, что я не заслужил пенсию его уровня, хоть по социальному положению мы примерно равны.

Его карьера — военное училище, лейтенант, старший лейтенант, капитан, майор, подполковник.

Мой профессиональный рост — вуз, инженер-механик, конструктор III категории, конструктор II категории, ведущий конструктор. Стаж работы ведущим конструктором более 10 лет. Мои изделия работают (и тиражируются) в Беларуси, России, Украине, Болгарии.

И где же здесь логика, справедливость?! Всю жизнь мне недоплачивали, а сейчас еще и нищим сделали.

Я догадываюсь, почему это так.

Есть в нашей современной истории один момент, который замалчивают, и понятно почему. Известно, что после распада СССР Беларусь приютила чуть ли не половину всех офицеров-пенсионеров бывшей Советской Армии (такова уж была репутация нашей республики).

Спрашивается: а какая экономика, какой бюджет может выдержать такую финансовую нагрузку? Сколько нужно мужиков, чтобы прокормить такую ораву "генералов"? И поэтому их "загрузили" в госбюджет, что дает возможность повышать их пенсию чуть ли не по графику автоматом (январское — 13%, майское — еще на большую величину), а для нас нет средств и на выплату мизера. Куда там до повышения?

Я требую:

2.Всем пенсионерам выплачивать пенсии из госбюджета Республики Беларусь (на переходный период).

Представляю, что тут начнется.

А почему бы и нет?!

Я всю жизнь своим трудом создавал, крепил бюджет. Известно, что из-за непомерных запросов Министерства обороны рухнула экономика СССР.

Скажите, кому нужно надувание щек, это глупое бряцание устаревшим военным хламом? Ответьте мне толком. Зачем Республике Беларусь армия в ее нынешних размерах? Зачем этой армии нужно столько танков, самолетов, тяжелой артиллерии?

Беларуси, на мой взгляд, нужна максимум мобильная бригада, и еще могут быть железнодорожные войска.

История показала, что Беларусь не спасет никакая армия. В час X по ней может прокатиться любой военный каток, все равно откуда — с Запада на Восток или с Востока на Запад. Республике Беларусь нужен **НЕЙТРАЛИТЕТ!**

Зачем Беларуси столько чиновников? Сократить можно целую армию опричников.

Кому нужно областное деление? Ведь все знают: серьезные вопросы решаются в Минске. Нужно только укрупнить районы.

Я требую:

3.Уравнять всех работающих пенсионеров в их правах!

Что это за демократия? Какие права человека?!

У меня пенсия 350 тысяч рублей. Ее тут же урезают, если я работаю. Рядом работает (допустим, сторожем) тот же пенсионер-подполковник. Его пенсия более 600 тысяч рублей. Но его почему-то щадят, не трогают! По какому праву?

Что за фортели закона?!

Нет, я не хочу сказать, что военные пенсионеры у нас живут. При нынешних ценах и их пенсии не очень-то высокие. Но я хочу, чтобы государство повернулось лицом и к таким, как я. Разве это нормально доживать жизнь в полной нищете?

Михаил Николаевич ГОРЕЛИК,
пенсионер, житель Минска.

ПАЛІТКУХНЯ

Калякін не хоча быць лідэрам пенсіянераў...

Першым сакратаром ЦК Партыі камуністаў Беларускай пераабраны Сяргей Калякін. 250 дэлегатаў з'езда ПКБ, які прайшоў у ДК МАЗа, вырашылі *"коней на пераправе не мяняць"*.

Каля 250 дэлегатаў з'ехаліся на справаздачна-выбарны з'езд Партыі камуністаў Беларускай у Мінск. Пры гэтым найбольшая колькасць дэлегатаў дасягнула ўзросту 51—60 гадоў (94 чалавекі), ва ўзросце за 60 — 78 чалавек, 48 дэлегатаў маюць за плячыма 41—50 гадоў, ад 31 да 40 гадоў — 21 чалавек і да 30 гадоў — 9 дэлегатаў. Старэе кампартыя відавочна, аднак па дысцыплінаванасці ПКБ можа даць фору любой апазіцыйнай сіле.

Сяргей Калякін заявіў на з'ездзе, што *"Партыя камуністаў будзе ў авангардзе дэмакратызацыі"*, хаця Партыя камуністаў, як і ў цэлым беларуская апазіцыя, панесла ў 2003—2007 гадах *"не проста сур'ёзныя, а нават небяспечныя страты"*. *"Сыходзіць з жыцця старая гвардыя камуністаў — па 800—900 чалавек штогод. А замяняюць іх усяго 100—150 чалавек. Акрамя таго, не ўсе вытрымліваюць і ламавы націск улады. Асабліва ў невялікіх гарадах і на вёсцы, дзе, пазбаўленыя працы, практычна не могуць знайсці новую. У выніку на 1 сакавіка колькасны склад ПКБ склаў 3128 чалавек"*, — адзначыў лідэр камуністаў.

Гэтыя праблемы ў сваю чаргу ставяць перад кампартыяй у якасці першачарговых дзве задачы: *"навучыцца абараняць камуністаў ад самадурства ўладаў"* і стварыць *"эфектыўную маладзёжную праграму, рэалізацыя якой дазволіць істотна пашырыць прыток у партыю юнакоў і дзяўчат левай арыентацыі"*.

Натуральна, старэнне партыі можа выліцца ў выраджэнне — без падпіткі свежай крывёю. Таму *"амаладжэнне"* ПКБ — гэта асноўная задача на бліжэйшую перспектыву.

Разам з тым Партыя камуністаў не бачыць сваю структуру па-за межамі Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Прынамсі, кіраўніцтва ПКБ. Бо сярод шэраговых сябраў яшчэ моцныя антыкааліцыйныя настроі. Нездарма ў апошні год на адрас лідэраў кампартыі раздаюцца папрокі ў тым, што сам факт абрання старшынёй Палітсавета АДС Сяргея Калякіна (у час апошняй прэзідэнцкай кампаніі) істотна паслабіў партыю. Ад падобных закідаў нікуды не дзецца, як і ў адзіночку нельга пакінуць карабель, які ідзе на дно.

Хаця на цяперашнім з'ездзе большасць прысутных пагадзілася: супраць супольнай бяды трэба выступаць агульнымі намаганнямі. Праўда, калі ідзе гаворка пра сумесныя дзеянні, то камуністы перш за ўсё маюць на ўвазе незарэгістраваны Саюз левых партый, а не Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы ў цэлым. Нездарма лідэры партый (в.а.старшыні БСДП Анатоль Ляўковіч, старшыня партыі жанчын "Надзея" Алена Яськова) прысутнічалі на з'ездзе ў якасці ганаровых гасцей.

— Пакуль гэтая праца (па стварэнні СЛП. — **Аўт.**) застаецца на ўзроўні дэкларацый, хаця магчымасці надзвычай шырокія. На любым заводзе ў Магілёве працуюць людзі, якія спавядаюць, скажам, як сацыял-дэмакратычныя, так і камуністычныя перакананні. Спалучэнне намаганняў дасць велізарны эфект, — мяркуе першы сакратар Магілёўскага абкама партыі Валерый Беразіенка.

І ўсё ж з карабля пад назвай "Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы" нікуды не дзецца. Партыя камуністаў з'яўляецца не проста адным з мацнейшых суб'ектаў АДС, але і, па выказванні Сяргея Калякіна, *"будзе ў авангардзе дэмакратызацыі"*. Лідэр кампартыі заклікаў дэлегатаў абавязкова прыехаць на Кангрэс дэмакратычных сіл і прагаласаваць за дакументы, якія бачацца ПКБ рухавіком пераменаў. Ведаючы ўзровень дысцыпліны, можна смела сцвярджаць: камуністы сваё слова скажуць...

— Сітуацыя ў краіне — як нацягнутая струна. Перамены абавязкова адбудуцца, і будзе вельмі крыўдна, калі мы акажамся ўсяго толькі гледачамі, — падсумаваў двухдзённую працу з'езда новы стары лідэр.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ПРЫГАВОР

«Вышка» для серыйнага забойцы

Крывавы шлях гродзенскага "пярэваратня ў пагонах" завяршаецца лагічным фіналам: 22 мая Вярхоўны суд Беларусі прыгаварыў былога міліцыянта Аляксандра Сяргейчыка да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Прыгавор абскарджванню не падлягае.

Судзілі былога міліцыянта ў Гродне — там, дзе з 1992-га па 2006 год нелюдзь тварыў сваю крывавую справу. Былы камандзір роты Гродзенскага райаддзела Дэпартамента аховы МУС Аляксандр Сяргейчык на працягу 14 гадоў пад міліцэйскім прыкрыццём учыняў на тэрыторыі абласнога цэнтра цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы.

Суд прызнаў Аляксандра Сяргейчыка вінаватым па шасці эпізодах забойстваў, кваліфікаваных як здзейсненае *"з асаблівай жортскасцю, з мэтай прыхаваць іншае злачынства, з хуліганскіх пабуджэнняў асобай, якая раней учыняла забойства"*. Суд прызнаў А.Сяргейчыка таксама вінаватым у згвалтаванні, крадзяжы маёмасці, у тым ліку крадзяжы агнястрэльнай зброі, незаконным нашэнні, захоўванні, перавозцы агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў і выбуховых прыстасаванняў, а таксама здзяйсненні іншых злачынстваў.

Суд быў закрытым. Аляксандр Сяргейчык, паведамляе прэс-служба Вярхоўнага суда, прыгавораны да вышэйшай меры — смяротнага пакарання з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем *"пярэваратня"* спецыяльнага звання — старшы лейтэнант міліцыі.

Прыгавор не падлягае абскарджванню. Аляксандр Сяргейчык, праўда, мае права звярнуцца з хадайніцтвам аб памілаванні да Аляксандра Лукашэнкі, аднак, маючы за плячыма *"ўвесь джэнтльменскі набор"* злачынстваў, на памілаванне *"пярэваратню"* спадзявацца наўрад ці варта.

Серыйны забойца працаваў у органах МУС 14 гадоў, скончыў Акадэмію МУС. Забіў 11 дзяўчат і маладога чалавека. Суд праходзіў у Гродне, дзе жыве большасць пацярпелых і сведак па справе.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 МАЯ 2007 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Кто провоцировал беспорядки 25 марта 2006 года?

Олег Волчек провел собственное расследование и нашел ответ на этот вопрос.

Руководитель юридической службы А.Козулина Олег Волчек обратился с очередной жалобой в прокуратуру Республики Беларусь. На этот раз по факту участия внутренних войск в разгоне мирных граждан 25 марта 2006 года. Во время суда над экс-кандидатом в президенты А.Козулиным не были всесторонне расследованы причины и следствия происходившего в этот день: на каком основании в город ввели войска, кто дал команду применять оружие в отношении мирных граждан? На все эти вопросы у судьи А.Рыбакова был один ответ: "Это не имеет отношения к делу!"

У юридической группы А.Козулина иное мнение на происшедшие события. На ее взгляд, сценарий обвинения рождался не в зале судебного заседания. Случайно ли основными свидетелями обвинения стали военнослужащие срочной службы, якобы пострадавшие от "активных участников несанкционированной акции, нарушителей общественного порядка"? Как выяснилось в ходе судебного заседания, 25 марта пострадали не только Александр Козулин, получивший удар в спину от полковника Д.Павличенко, но и десятки женщин, студентов, пенсионеров, на которых власть в этот день испытала широкий арсенал спецсредств (дымовые шашки и шумовые гранаты, дубинки).

Юридическая группа А.Козулина в течение года собирала и анализировала вещественные доказательства превышения служебных полномочий руководителями силовых структур. Свидетельские показания, фото-, видеоматериалы полностью опровергают показания свидетелей обвинения и обвинительный приговор, вынесенный А.Козулину. Сторонники экс-кандидата в президенты требуют возбудить уголовное дело и привлечь к ответственности руководителей спецподразделений, направивших оружие против собственного народа.

Пресс-служба А.Козулина обратилась к Олегу Волчеку с просьбой прокомментировать поданную жалобу.

Граждане, пройдя площадь Богушевича, не выходили на проезжую часть и не препятствовали движению транспорта в направлении микрорайона "Юго-Запад". Сотрудник ДПС регулирует движение транспорта.



Граждане идут по тротуару по проспекту Дзержинского в направлении приемника-распределителя на ул. Окрестина. Шеренга солдат перекрыла тротуар и проезжую часть в обоих направлениях.

А.В.Козулин разговаривает с руководителями спецподразделений.

А.В.Козулин после разговора уходит в сторону ул. Немига. Никого ни на какие действия он не организовывает.

Люди развернулись и идут в направлении улицы Немига. Сопротивления солдатам никто не оказывает. На фото виден взрыв гранаты.

Солдаты избивают дубинками лежащего гражданина.

Избитый гражданин с черепно-мозговой травмой.

Со стороны спецподразделений в направлении граждан летит граната.

На фото видно, как ведется стрельба из оружия в направлении людей.

— Генеральный прокурор Петр Миклашевич вечером 25 марта 2006 года заявил, что все организаторы несанкционированных акций и их активные участники понесут административную или уголовную ответственность в соответствии с законом и в зависимости от степени вины. Однако спустя три месяца в зале судебного заседания выяснилось, что и организатором, и активным участником акции был якобы только Козулин.

— Как бывший следователь прокуратуры я провел собственное расследование событий того дня. И ответственно заявляю, что в действиях А.Козулина нет состава инкриминируемого ему преступления.

У меня есть все доказательства и основания утверждать, что предварительное расследование и судебные разбирательства по эпизоду 25 марта 2006 года были проведены неполно, невсесторонне, с обвинительным уклоном, поскольку не были предприняты все меры для установления полной картины происходящего и не исследованы все обстоятельства происшедшего.

У меня нет сомнений, что провокация на проспекте Дзержинского была устроена не группой мирно шествовавших по тротуарам граждан, а спровоцирована руководством правоохранительных органов, которое отдало приказ на незаконное применение физической силы, спецсредств и оружия к мирным гражданам.

— Суд тем не менее обвинил А.Козулина в организации несанкционированных групповых действий. Как Вы считаете, на чем это было основано?

— В ходе судебного заседания фактически не было подтверждено обвинение, что именно А.Козулин сформировал группы граждан и склонил их к действиям, грубо нарушающим общественный порядок, что он руководил этими действиями. Не было доказано, что кто-либо вообще организовывал граждан к подобным действиям. А ведь это обязательные признаки данного состава преступления.

Я считаю, что в основу обвинения было положено мнение министра внутренних дел В.Наумова, который заявил, что Козулин *"стал призывать к насильственному смещению власти, значит... нападению на государственные и охраняемые объекты, даже прозвучал призыв, и вы это хорошо знаете, к физической ликвидации главы государства"*. Также в заявлении Прокуратуры страны от 29 марта 2006 года, принятого на заседании Коллегии прокуратуры, было сказано: *"...При прямом подстрекательстве Козулина и Милинкевича участниками несанкционированной акции были совершены действия, направленные на нарушение общественного порядка, сопряженные с воспрепятствованием нормальному функционированию транспорта и других объектов городского хозяйства, избиты сотрудники Белтелерадиокомпании"*.

Эти заявления высших должностных лиц правоохранительной системы послужили основанием для дальнейших действий следователей и судей.

Однако из не приобщенной к материалам дела видеозаписи, зафиксировавшей выступление А.Козулина в сквере Я.Купалы, четко слышно, что А.Козулин говорил следующее: *"Сегодня тысячи героев Беларуси томятся в тюрьмах. Свободу им! Все на Окрестина после митинга. Мы должны потребовать свободу заключенным. Мы никого не должны оставить без внимания, без защиты"*. А.В.Козулин просто просил граждан пройти на Окрестина и тем самым поддержать десятки задержанных граждан. В словах Козулина нет призыва к нападению на охраняемое госучреждение. Также в словах А.Козулина не звучит призыв к физической ликвидации главы государства. А.Козулин сказал следующее: *"Оружие пусть направят против себя. Последнюю пулю Лукашенко пусть оставит сам себе"*.

Говорить в целом о слаженности и спланированном походе группы граждан на улицу Окрестина не приходится, потому как множество фактов и десятки свидетельств указывают на стихийность последующих действий и передвижений.

— В основу обвинения было положено то, что якобы граждане препятствовали движению транспорта, деятельности предприятий торговли и отдыху граждан. Подтверждается ли это проведенным Вами расследованием?

— Движение граждан началось со сквера Я.Купалы. Они шли по тротуарам, соблюдали правила дорожного движения, не создавали помех и препятствий в работе общественного транспорта. Свидетельством этому является множество фотографий, зафиксировавших передвижение групп граждан, и свидетельств очевидцев. Граждане шли группами вплоть до площади Богушевича. Во время их движения никто из сотрудников ГАИ не зафиксировал ни единого нарушения Правил дорожного движения.

В суде стороной обвинения не были заявлены свидетели, которые бы утверждали, что участники шествия мешали нормальной жизнедеятельности жильцов близлежащих жилых домов. Следствие не представило также свидетельств того, что идущие граждане препятствовали нормальной работе торговых предприятий.

Из фотографий видно, что еще до того, как первая группа людей подходила к площади Богушевича, сотрудниками ГАИ уже проводились мероприятия по ограничению движения транспорта на проспекте Дзержинского.

По материалам судебного разбирательства было установлено, что группы граждан подошли к пл.Богушевича около 16 часов. Это значит, что еще за полчаса до того, как подошла первая группа, проспект был уже перекрыт внутренними войсками. Утверждение, что будто колонна граждан во главе с А.В.Козулиным перекрыла улицу, является безосновательным.

— Прокуратура заявляла, что группа агрессивно настроенной молодежи попыталась прорвать цепь солдат, забрасывая их камнями и бутылками. При этом было взорвано неустановленное шумовое устройство и брошено несколько зажженных дымовых шашек. Почему же тогда следствие не представило вещественных доказательств?

— В документальном фильме "На передовой Правды", материал которого охватывает весь период событий 25 марта на площади Богушевича, не видно агрессивных граждан, забрасывающих бутылками, камнями, кусками бордюрного камня военнослужащих, что утверждалось свидетелями обвинения. Что помешало задержать Козулина уже тогда, если он нарушал общественный порядок, а не через 300 метров, когда Козулин шел практически один в сторону церкви по улице Немига? Почему не было произведено важное процессуальное действие — осмотр места происшествия, фиксация и изъятие орудий преступления? Считаю, что это было сделано с умыслом, т.к. данные процессуальные документы полностью бы обличали неправомерные действия силовых структур и могли бы послужить впоследствии доказательствами против руководителей и исполнителей побоища в центре Минска.

По сведениям белорусских правозащитных организаций, во время событий 25 марта 2006 года на проспекте Дзержинского было задержано 57 человек. Согласно имеющимся спискам задержанных, мною проведен анализ состава задержанных по различным признакам. Основной состав — служащие и студенты, предприниматели, пенсионеры. Ровно 40% задержанных составляли девушки и женщины. Так против кого спецслужбы проводили силовую операцию с применением специальных средств?

— За эпизод 25 марта суд приговорил А.Козулина к трем годам лишения свободы. Каковы были его действия? Насколько обоснованно данное обвинение?

— Начну с того, что движение солдат началось после приказа одного из командиров СОБРа: "Собры, вперед, на врага!", и солдаты, стуча по щитам резиновыми дубинками, направились в сторону граждан.

На фото- и видеоматериалах видно, что А.В.Козулин идет с гвоздикой в руках и спокойно разговаривает с руководителями спецподразделений. А.В.Козулину было разъяснено, что люди не могут пройти в сторону улицы Окрестина. Он тут же разворачивается и уходит в сторону граждан. При этом он просит всех развернуться и идти к церкви на Немигу, чтобы поставить свечи в поддержку томящихся на Окрестина.

Как только А.В.Козулин начал движение, за ним сразу же двинулись шеренги солдат, которые начали вытеснять людей.

— Что в таком случае послужило основанием для применения спецсредств и оружия против граждан?

— Я убежден, что события начали разворачиваться не по спланированному властью сценарию: никаких агрессивных действий со стороны граждан не происходило, но солдаты, экипированные по полной боевой готовности, должны были выполнить свою миссию. Власти нужно было столкновение, чтобы сделать А.Козулина виновником.

— Солдаты применили против граждан оружие и спецсредства. Много было пострадавших среди мирных граждан?

— На фотографиях были запечатлены четыре человека, которым были причинены значительные телесные повреждения. В средствах массовой информации прошло сообщение, что один человек погиб. Он якобы скончался в 9-й клинической больнице. Также прошла информация, что исчезли несколько человек, которые получили увечья. Юридическая группа А.В.Козулина в апреле 2006 года сообщала о пропавших после демонстрации 25 марта активистах штаба Олеге Матюке и Валерии Марчуке. Я заявлял об указанных гражданах в ГУВД Мингорисполкома в отдел по розыску пропавших. По прошествии некоторого времени мне позвонили и сказали, что разыскивать их не будут, поскольку обращаться с подобным заявлением в ГУВД должны близкие родственники.

Предположения о погибших подтверждает письмо сотрудницы Республиканской больницы Управления делами Президента Республики Беларусь, распространенное в Интернете, в котором утверждалось, что имелся погибший молодой человек, труп которого забрали и увезли в неизвестном направлении люди в черной одежде.

Защита ходатайствовала о допросе в суде очевидцев и пострадавших. Судья Рыбаков под любым предлогом откладывал допрос свидетелей со стороны защиты, отклонял ходатайства защиты и в этой части. Лишь под напором обвиняемого и его защиты к концу судебного заседания удалось допросить нескольких свидетелей защиты. Свидетели Любовь Лунева, корреспондент Радио Свобода, Наталья Походня и другие однозначно пояснили, что со стороны граждан не была применена физическая сила.

Юридическая группа А.В.Козулина и сейчас готова представить свидетелей событий 25 марта, которые не были допущены к даче показаний судьей А.В.Рыбаковым.

— Олег, а кто, на Ваш взгляд, мог отдать приказ о вводе войск и проведении спецоперации 25 марта 2006 года?

— В СМИ было опубликовано много информации, что "добро" на проведение силовой операции мог дать только главнокомандующий ВС РБ А.Лукашенко. Согласно ст.8 Закона РБ "О внутренних войсках Министерства внутренних дел Республики Беларусь" именно президент РБ осуществляет общее руководство внутренними войсками, он дает приказ о привлечении внутренних войск для усиления охраны общественного порядка, обеспечения общественной безопасности, режима чрезвычайного положения, военного положения. В соответствии с данным законом таких прав нет ни у командующего внутренними войсками В.Гайдукевича, ни у министра внутренних дел В.Наумова.

— Какова Ваша юридическая оценка происшедших событий?

— Командование внутренних войск 25 марта 2006 года превысило свои служебные полномочия, давая команду на разгон мирных граждан и применение к ним спецсредств.

Согласно ст.18 Закона о внутренних войсках, физическая сила, специальные средства, оружие, боевая и специальная техника применяются исходя из складывающейся обстановки в случаях, когда промедление в их применении создаст непосредственную опасность для жизни людей или может повлечь иные тяжкие последствия. Применению должно предшествовать четко выраженное и очевидное для лица, против которого они применяются, предупреждение о намерении их применить. При этом, применяя спецсредства и оружие, военнослужащие обязаны принять все возможные меры для обеспечения безопасности граждан и стремиться причинить наименьший вред их здоровью, чести, достоинству и имуществу. В случае превышения их полномочий во время применения физической силы или оружия военнослужащие подлежат ответственности в соответствии с законодательством.

Согласно ст.21 Закона о внутренних войсках, запрещается применять оружие при значительном скоплении людей, когда от этого могут пострадать посторонние лица; в отношении женщин, лиц с явными признаками инвалидности, несовершеннолетних, за исключением случаев совершения указанными лицами вооруженного нападения на военнослужащих внутренних войск и работников милиции.

Я считаю, что руководители и исполнители, ответственные за подобное развитие событий, совершили преступление, предусмотренное ч.3 ст.426 УК РБ.

— Олег, это Ваша третья жалоба по эпизодам, вменяемым в вину А.Козулину. Неужели Вы рассчитываете на ее объективное рассмотрение?

— Моя третья жалоба преследует те же цели, что и две предыдущие — доказать невиновность А.Козулина и по третьему эпизоду, который ему вменялся. Хочу указать, что собранные нашей группой доказательства могут послужить основанием для полного и всестороннего пересмотра дела А.Козулина, которое находится сейчас на рассмотрении в Верховном суде РБ. Ответственно заявляю, что должностные лица, препятствующие полному и всестороннему рассмотрению дела, могут быть впоследствии привлечены к ответственности по статьям, касающимся должностных преступлений, как в действии, так и в бездействии.

Для меня, профессионального юриста, ясно одно — А.Козулин содержится в колонии незаконно!

Иван ЛИПСКИЙ.

САЛІДАРНАСЦЬ

Жыхары Магілёва патрабуюць вызваліць Казуліна

50 жыхароў Магілёўскай вобласці звярнуліся ў Вярхоўны суд Беларусі з хадайніцтвам адмяніць прыгавор суда Маскоўскага раёна Мінска старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандру Казуліну.

Грамадзяне лічаць, што прыгавор, які быў вынесены палітыку, з'яўляецца несправядлівым, і патрабуюць цалкам апраўдаць экс-кандыдата ў прэзідэнты.

Пад хадайніцтвам таксама паставілі свае подпісы прадстаўнікі розных апазіцыйных палітычных партый, сярод якіх старшыня Магілёўскай гарадской арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі Сяргей Стральцоў і яе актывісты Ірына Качарова і Сяргей Няроўны (Крычаў), старшыня абласной арганізацыі БСДП Юрый Новікаў, старшыня Ленінскай раённай арганізацыі БСДП Магілёва Мікалай Расюк, старшыня Бабруйскай гарадской арганізацыі БСДП Таісія Кабанчук, лідэр кампаніі "За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва" Алена Мядзведзева (Бабруйск), актывісты Партыі БНФ Дзмітрый Салаўёў і Сяргей Нягацін, актывіст Партыі камуністаў Беларускай Анатоль Заўялаў, а таксама шэраг актывістаў грамадскіх арганізацый.

Ігар БАРЫСАЎ.

АТАМНЫ ПРАЕКТ

Украіна зараз гатова паспрыяць будаўніцтву беларускай АЭС

Спіс краін, гатовых рэалізаваць мару Аляксандра Лукашэнкі пабудаваць у Беларусі АЭС, папоўніўся яшчэ адным магчымым падрадчыкам. Жаданне ўдзельнічаць у конкурсе на права будаўніцтва АЭС у Беларусі выказала Украіна, такім чынам далучыўшыся да Расіі, Францыі, Кітая і Ірана — менавіта гэтыя краіны згадваліся ў якасці магчымага падрадчыка па будаўніцтве АЭС.

"Украіна гатова ўдзельнічаць у будаўніцтве АЭС у Беларусі і забяспечыць краіну ўранавай сыравінай", — заявіў міністр паліва і энергетыкі Украіны Юрый Бойка на брыфінгу ў кабінеце міністраў, паведамляе УНІАН.

КАРАВУЛ!

На склад

Паводле звестак, на 1 мая 2007 года запасы гатовай прадукцыі на прамысловых прадпрыемствах Беларусі павялічыліся ў фактычных цэнах з пачатку года на 40,2%. Пра гэта паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці ў студзені-красавіку 2007 года ў фактычных цэнах склалі 65,6%. У фактычных цэнах на складах замарожана 3 трыльёны 558,7 мільярда рублёў.

Максімальныя запасы гатовай прадукцыі на 1 мая па розных таварных групах склалі: бытавыя гадзіннікі — у 28,3 раза больш за сярэднямесячны аб'ём вытворчасці, тканіны шарсцяныя — у 4,3 раза, тканіны льняныя — у 4,9 раза, цукар — у 8,9 раза. Панчошна-шкарпэтачных вырабаў сабралася 246,9% сярэднямесячнага аб'ёму, абутку — 159,9%, круп — 238,6%, металарэзных станкоў — 273,5%, тэлевізараў — 253,9%.

Мінімальныя запасы: мінеральныя ўгнаенні — 1%, грузавыя аўтамабілі — 30,4%, гарэлка і лікёра-гарэлачныя вырабы — 19%, цэмент — 10,9%.

Марына НОСАВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 МАЯ 2007 г.

ДОЖИНКИ-2007

Какими будут награды?

Еще неизвестно, каким будет урожай, а уже утверждено, какими будут за него награды. Решение об этом содержится в постановлении Совета министров № 595.

Вообще, на организацию “Дожинок” в этом году государство выделяет 8 миллиардов белорусских рублей. Для победителя среди областей учрежден 1 почетный диплом с денежной премией в сумме 50 миллионов рублей. Среди районов — 6 почетных дипломов с денежными премиями по 30 миллионов каждая. Если по итогам соревнования победителями выходят два района, один из которых за последние пять лет, включая 2007 год, становился победителем такого соревнования, то и этот район награждается почетным дипломом и денежной премией, которые учреждаются для этого дополнительно.

Для награждения победителей среди сельхозпредприятий учреждено 18 почетных дипломов с денежными премиями. Так, премия за первое место составит 20 миллионов, за второе — 15 миллионов, за третье — 10 миллионов. Если по итогам соревнования на первое место выйдут две организации, одна из которых за последние 5 лет, включая 2007 год, становилась победителем такого соперничества, то и эта организация будет награждена почетным дипломом и денежной премий в сумме 20 миллионов.

Победителей соревнования среди главных агрономов в смотре-конкурсе повышения культуры земледелия ждут 12 почетных дипломов с премиями в сумме 5 миллионов рублей каждая. В таком же размере будет поощрен труд лучших главных инженеров сельскохозяйственных организаций.

Особый интерес всегда вызывает соревнование механизаторов. Для старших комбайнеров учреждено 6 почетных дипломов и ценные призы (автомобиль — за первое место, холодильник — за второе, морозильник — за третье). Победитель среди механизаторов, занимавший ранее первое место в таком соревновании, будет награжден почетным дипломом, компьютером и денежной премией в 9 миллионов рублей.

Лучших помощников комбайнеров тоже ждут 6 почетных дипломов и ценные подарки (компьютер — за первое место, газовая плита — за второе, телевизор — за третье).

Победители соревнования среди старших комбайнеров сельхозорганизаций, помимо почетных дипломов, за первое место получат легковой автомобиль, за второе — холодильник, за третье — морозильник.

Напомним, что “Дожинки” в нынешнем году пройдут в Речице.

Ирина МАЛЬЦЕВА.

ОТОВСЮДУ

Полоцк — самый древний город Беларуси

В Полоцке начались торжества, посвященные 1145-летию города. Знаменательную дату город будет отмечать почти две недели. Власти обещают, что каждый день празднеств будет насыщен развлекательными и познавательными мероприятиями.

Апофеозом торжеств станут заключительные дни 2—3 июня. На праздновании ожидаются делегации 14 городов-побратимов из России, Украины, Молдовы, Германии, Швеции, Болгарии, Польши.

Плохая новость для солдата

В Беларуси планируется изменение продолжительности отпусков военнослужащих срочной службы. Это нововведение содержится в поправках в Закон “О статусе военнослужащих”.

Действующий сегодня закон предусматривает предоставление проходящим срочную военную службу обязательного отпуска за весь период службы. Его продолжительность для солдат — 20 суток, для сержантов и старшин — 25. В порядке поощрения отпуск увеличивается еще на 5 суток.

Согласно новому нормативному акту, предлагается предоставлять военнослужащим отпуска пропорционально продолжительности срока военной службы по призыву. Солдатам, которые служат 18 месяцев, будет положен отпуск сроком на 10 суток, сержантам и старшинам — на 15, а тем, кто служит 12 месяцев, — соответственно на 5 и 10 суток. Поскольку военнослужащие, прошедшие обучение на военных кафедрах или факультетах вузов, находятся на службе только 6 месяцев, то отпуск им предоставляться не будет.

У всех жильцов будут счетчики

В 2007 году счетчиками должны были быть оснащены 42% квартир, к 2008-му — 54%, к 2010-му — 80%. Соответственно должен повышаться и уровень оплаты услуг ЖКХ. Если в 2006 году белорусы оплачивали только 46% оказываемых им услуг, а остальное субсидировало государство, то к 2010 году они должны будут оплачивать уже 62% себестоимости услуг.

В 2008 году индивидуальными счетчиками учета воды должны быть оснащены 100% квартир.

Не хочу учиться...

Около двух десятков голов крупного рогатого скота на сумму около 20 миллионов рублей в течение нескольких месяцев похитили трое жителей поселка Ружаны. Один из троицы оказался совершеннолетним. Остальные — старшеклассники местной средней школы. Злоумышленники действовали на территории Гродненской области, обворовывая сельхозкооперативы, а сбывали скот по бросовым ценам в Брестской. Гродненский областной суд признал всех членов преступной группировки виновными и назначил наказание: лидеру воровской компании — 9 лет лишения свободы, его несовершеннолетним подельникам — по три года.

ВНИМАНИЕ!

Риск заразиться СПИДом при переливании крови все-таки есть

В Беларуси зарегистрировано два случая передачи ВИЧ-инфекции через донорскую кровь. Оба они произошли в 2005—2006 годах. Об этом корреспонденту БЕЛТА сообщил врач-эпидемиолог отдела профилактики ВИЧ/СПИД Республиканского центра гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья Владимир Зелюткин.

По его словам, случаи передачи ВИЧ от донора реципиенту регистрируются во всем мире, однако они крайне редки. В Беларуси каждый человек, выразивший желание стать донором, дает расписку о том, что он не заражен никакими инфекциями, передающимися через кровь. Ежемесячно в пункты сбора крови поступают списки всех ВИЧ-инфицированных, больных туберкулезом и просто психически неуравновешенных граждан. Помимо этого, придя сдавать кровь, каждый белорус должен иметь при себе справку о состоянии здоровья, которая не выдается, если он болеет, к примеру, гепатитом.

Вся кровяная плазма, предназначенная для переливания, проходит период карантинизации, когда она хранится в специальных холодильниках в течение трех месяцев с момента забора. После чего делаются повторные анализы, и, если у донора выявляется какая-то инфекция, плазма просто уничтожается. “Могу сказать, что антитела к ВИЧ выявляются нашими системами через 2,5—3 месяца после инфицирования в 95—96% случаев”, — добавил Владимир Зелюткин. Главное, не попасть в оставшиеся 4—5 процентов невезучих.

ЛЁС ЧАЛАВЕКА

Сцяжынкі жыцця Сержука Вітушкі

У часы нацыянальна-адраджэнскага руху ў Беларусі канца 1980-х — пачатку 1990-х Сяржук Вітушка стаяў побач з Зянонам Пазьняком. Ён быў адным з ініцыятараў стварэння і кіраўніком нефармальнай маладзёжнай арганізацыі “Талака”.

У 1991 годзе Вітушка прыняў рашэнне пераехаць у Вільнюс. Яго лёс склаўся вельмі няпроста. І, скажу шчыра, калі я дамаўлялася з ім аб інтэрв’ю, то не верыла, што Сяржук дасць згоду распавесці пра самыя складаныя часы свайго жыцця. Выпрабаванняў, якія яму выпалі, хапіла б на жыццё не аднаго чалавека. Але ён не зміры́ўся, а кожны дзень, кожную гадзіну, кожную хвіліну пераадольвае іх. Слабы фізічна, ён моцны духам, верай у людзей, у сябе, у будучыню Беларусі.

Мітынг у падтрымку перабудовы на стадыёне “Дынама”. 1989 г.

Сяржук Вітушка: 1987 г. (на фота зверху) і 2007 г.

«Вільня — гэта не эміграцыя»

— Сяржук, у сучаснай Беларусі нікога не здзіўляе той факт, што моладзь з’язджае ў замежжа і нярэдка там, у чужых краінах, будуе сваё жыццё. Вы пакінулі Беларусь на пачатку 1990-х, падчас росквіту адраджэнскага руху. Чым гэта было выклікана?

— Я пераехаў у Вільню, калі ўжо адбылася незалежнасць Беларусі. Мне здавалася, што ў нашай краіне ўжо ўсё здзейснілася, што наш цягнік стаў на свае рэйкі і пачаў рухацца ў правільным накірунку. Тады з’явіўся заклік Сяргея Дубаўца ствараць беларускую Вільню. І нас, маладых, многа пераехала ў літоўскую сталіцу. Нам здавалася, што перадавая беларускага фронту менавіта ў Вільні. Што без Вільні, без Беластока мы не можам існаваць як адзінае цэлае. Гэта не толькі наша гісторыя, гэта нашая сутнасць.

— Гэта ўжо патыхае перадзелам межаў.

— Мы хацелі вярнуць Вільню ў склад Беларусі духоўна. Ніхто не гаварыў пра перадзел межаў. Важна было, каб у Вільні адбываліся беларускія падзеі, з’явіліся беларускія ўстановы, жылі беларускія людзі. Вільня — гэта не эміграцыя.

У маім пераездзе быў не толькі грамадскі момант, але і асабісты таксама — тут утварылася мая сям’я.

Спачатку, безумоўна, у мяне былі цьмяныя ўяўленні, чым я тут буду займацца. З майго боку гэта быў трохі безадказны ўчынак. У Менску ўсё ж такі было больш сувязяў, знаёмстваў, бацькоўскі дом. Але патроху ўсё наладжвалася. Удалося стварыць беларускамоўную школу, у якой я выкладаў гісторыю. Працаваў, пакуль не расхварэўся. Сышоў з настаўніцкай працы, калі па стане здароўя ўжо не мог кожны дзень прыходзіць у школу. Набыў прафесію журналіста, працаваў пэўны час на беларускім радыё на “Балтыйскіх хвалях”, аднак радыё потым развалілася...

«Лячыць сябе — карпатлівая, цяжкая праца»

— Аднойчы раніцай я прачнуўся, расплюшчыў вочы, а вакол — цемра. Я ведаў, што такое магчыма, што, людзі, хворыя на цукровы дыябет, губляюць зрок. Але не думаў, што ўсё можа адбыцца так раптоўна, у адзін дзень.

Я хварэю з 1980 года. У мяне была бурная маладосць, на дыябет не звяртаў увагі. Лётаў па талакоўскіх сцяжынах і быў упэўнены, што са мною нічога дрэннага не здарыцца. Але няправільнае стаўленне да хваробы з майго боку і адсутнасць якасных, дасканалых лекаў не маглі не адбіцца на здароўі. Гэта сёння пры сучасных магчымасцях медыцыны тым, хто пачынае хварэць на дыябет, лягчэй захаваць сваё здароўе.

Я пачаў займацца сваімі балячкамі позна, толькі ў Вільні, калі прыціснула. Хаця лекар казаў, што не ўсё пры такім захворванні, як цукровы дыябет, залежыць ад чалавека. Хтосьці можа захварэць, і ў яго адразу выяўляюцца камплікацыі, а другі можа пражыць з дыябетам усё жыццё без істотных ускладненняў.

Да таго ж з 2000 года я вымушаны рабіць гемадыяліз — ныркі амаль не працуюць. Я сёння толькі тым і займаюся, што раблю ўсе гэтыя працэдуры, вытрымліваю дыеты, п’ю жменямі таблеткі... Каб у маладосці трошкі больш надаваў увагі свайму здароўю, каб рабіў хаця б адзін працэнт таго, што раблю зараз, то, магчыма, адчуваў бы сябе інакш. Таму мая парада маладым людзям — беражыце сваё здароўе. Работы дзеля будучыні Беларусі многа, многа на доўгіядоўгія гады, і трэба выпрацоўваць такую стратэгію, каб сіл хапіла на гэтыя гады. Не рабіце маіх памылак: вось зараз я згару за Беларусь — і ўсё паправіцца. Бацькі ўвесь час папярэджвалі мяне, прасілі сачыць за сваім здароўем, але ж я іх не слухаў, а з галавой кідаўся ва ўсе мітынгі. Канешне, я сёння ніводнай секунды не шкадую аб тым, як жыў і што рабіў. Але ж, калі б вярнуць тыя часы, то, безумоўна, інакш бы ставіўся да свайго здароўя...

Ёсць яшчэ адзін такі філасофскі момант. Я захварэў у савецкія часы. І бацькі, і дактары ў адзін голас гаварылі, што я павінен асцярожна жыць, не напружвацца. І гэта, на мой погляд, была памылка. Бо лячыць сябе — гэта карпатлівая, цяжкая праца. А яшчэ трэба недзе працаваць, чымсьці займацца, каб зарабляць на жыццё. І атрымліваецца, што хворы чалавек павінен працаваць за дваіх як мінімум. І таму, я мяркую, хворага чалавека, наадварот, трэба напружваць, таму што калі ідзеш па роўнай сцяжынцы, то траціш вось столькі сіл, а калі трапіў у яму, то сіл павінна быць у два разы болей. Трэба, каб чалавек не расслабляўся, не прывыкаў, што за яго нехта нешта зробіць, што ў яго ёсць нейкія льготы, яму будзе нейкая дапамога. Чалавека з першага дня хваробы трэба настройваць на тое, што ён павінен змагацца і працаваць за дваіх. У маім жыцці гэтага не было, і таму потым было так цяжка... Глядзець за сабой хвораму чалавеку, жыць у сям’і, сябраваць — гэта таксама праца. А я іншым разам мог падумаць: “Нічога, як-небудзь абыдзецца”. А трэба было валявымі высілкамі прымушаць сябе да гэтай работы.

— Вы сёння засталіся самнасам са сваімі праблемамі?

— Дзякуй Богу, у мяне ёсць родныя, многа сяброў, якія разумеюць і падтрымліваюць мяне, і ёсць радыё. Працягні руку, націсні кнопку — і цэлы свет на цябе абрынецца. Слухаю не толькі беларускія радыёстанцыі, але і рускую Свабоду, Бі-Бі-Сі і французскае радыё.

— Валодаеце некалькімі мовамі?

— На жаль, не. Затое дачка зараз вывучае некалькі моў. Паўлінка добра ведае беларускую і літоўскую мовы, вучыць французскую і англійскую, а таксама з вуліцы на побытавым узроўні асвоіла рускую і польскую. Гэтае шматмоўе закладзена ў яе з нараджэння. Я, напрыклад, калі пераехаў у Вільню, быў прыемна здзіўлены тым, што на вуліцах гучыць шмат моў, і людзі рэальна карыстаюцца імі.

— Вы — грамадзянін Беларусі. Не ўзнікае складанасцяў з лячэннем?

— У Літве я маю від на жыхарства. А гэта такі дакумент, які дае права карыстацца ўсім, я толькі не маю права абірацца ў парламент краіны. Я ўдзячны Літве за тое, што атрымліваю ўсю медыцынскую дапамогу, якая мне патрэбна. Атрымліваю бясплатна, а гэта вельмі вялікія грошы.

— Сяржук, а Вы не думалі аб такой аперацыі, як перасадка нырак?..

— Чаму не? У Літве ёсць чарга, і ў лісце чакання многа такіх жа хворых, як я. Каб рабіць перасадку, павінны сысціся ў адным некалькі акалічнасцяў — павінен з’явіцца донар, супасці група крыві і іншыя паказчыкі.... Мае родныя маглі б даць мне нырку, але ў нас кроў не адной групы. Вось і чакаю. За 7 год, праўда, ні разу з банка даных не патэлефанавалі.

— У Вас ёсць зараз праца?

— Час ад часу запрашаюць на Радыё Свабода, запісваюць мае развагі. Запрашалі на перадачу “Начная Свабода”, “Я веру”. Некалькі гадоў таму на радыё быў вялікі цыкл “Сучасныя мемуары”, які распачаў Васіль Быкаў. І я таксама апынуўся ў кампаніі паважаных людзей — акрамя Быкава сваімі ўспамінамі са слухачамі дзяліліся Багданкевіч, Шушкевіч і іншыя...

На сённяшні момант я сам сабе прыдумаў працу. Яна вырасла з майго хобі — я заўзяты слухач Беларускага радыё. Слухаю Радыё Свабода, Радыё “Рацыя”, “Акно ў Еўропу” і Радыё “Палонія”. І потым раз на тыдзень раблю агляды для інтэрнет-газеты “Свабода”.

— А як пішаце свае тэксты?

— Калі начытваю тэкст на дыктафон, а калі і пішу сам. Ёсць такая адмысловая камп’ютэрная праграма для сляпых людзей, якая агучвае націск кожнай клавішы і тэкст, што на экране. Зараз яе якраз і асвойваю. Друкую марудна, лацінскімі літарамі, таму што беларускай версіі ўвогуле няма, а рускую яшчэ не паставіў.

«Выздараўленне ад камуністычнай ідэалогіі наступіла пасля Курапатаў»

— Сяржук, як часта Вы ўзгадваеце тыя часы, калі ствараласа “Талака”?

— Мне здаецца, што занадта часта. Я абмежаваны ў сваіх рухах, у доступе да свежай інфармацыі, і мазгі ўсё часцей выцягваюць з мінулага самыя лепшыя гады. Я вяртаюся ў райскія часы — у сваё дзяцінства, маладосць, калі быў здаровы. Вяртаюся ў тыя часы, калі было побач шмат сяброў, і мы імкнуліся нешта зрабіць. І былі ў нас не толькі паразы, але і перамогі.

— А як сталася, што Вы апынуліся ў першых радах адраджэнскага руху? Адкуль у Вас была такая прага да ўсяго беларускага? Вы скончылі рускамоўную школу, працавалі наладчыкам на “Інтэграле”...

— Так, у школе я не быў патрыётам Беларусі. Наадварот, памятаю такі смешны эпізод, калі на ўроку беларускай літаратуры я набраўся нахабнасці і выказаў ад усяго класа пратэст настаўніцы, што мы не хочам вучыць на памяць урывак з трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”... Але нейкія зярняткі беларускасці ва мне ўжо прарасталі.

Па-першае, беларускасць падтрымлівалася і ў маёй сям’і. Адна мая цётка працавала ў музеі Янкі Купалы, другая — выкладала беларускую мову і літаратуру ў школе. Мая старэйшая сястра паступіла на філалагічны факультэт БДУ на аддзяленне беларускай мовы. У хаце было многа беларускіх кніг. І “Песняроў” бацькі слухалі, і за сталом спявалі беларускія песні. Дома бацькі размаўлялі на трасянцы, а вось бабуля, да якой я кожнае лета прыязджаў на канікулы, — на чысцюткай беларускай мове. Яна жыла непадалёку ад Вязынкі, у вёсцы Кісялі. Я быў “Волькі Пётрачкавай унук”. Дзеда я не памятаю, ён загінуў у часы вайны. У вёсцы мяне здзіўляла, што ўсе рэчы называліся не так, як у горадзе. Калі бацька пачынаў нешта майстраваць, то прасіў падаць яму гэблік, склюд. Кожны інструмент меў сваю назву. Вакол вёскі кожны кавалачак зямлі, кожны пралесак меў сваю назву. Гэтая этнаграфія мяне зачароўвала...

— А калі Вы пачалі размаўляць па-беларуску, як адбываўся гэты пераход?

— Пасля школы размаўляў на чыстай рускай мове, потым было тэхнічнае вучылішча, завод “Інтэграл”. Але беларуская мова наспявала. Магчыма, таму, што ў тым часе я страціў бацьку, ён трагічна загінуў. Магчыма, мая хвароба... Гэта ўсё мяне выбівала з агульнай сцяжынкі, па якой пайшлі мае калегі па вучылішчы. Яны цікавіліся дзяўчатамі, выпіўкай, кампаніямі, а я быў з гэтага выключаны. Я любіў чытаць, захапіўся Караткевічам. І так сталася, што ў той дзень, калі паміраў Караткевіч, я перачытаў “Ладдзю Роспачы”. У мяне склалася ўражанне, што ён памёр за Беларусь. Па сутнасці так і было. Уладзімір Караткевіч змагаўся за нас. Ён пісаў так цікава, што хацелася чытаць па-беларуску, гаварыць па-беларуску, быць беларусам. І мне стала сорамна, што я размаўляю па-руску. У той жа вечар я прыняў рашэнне размаўляць на роднай мове. Канечне, не адразу ўсё атрымалася. Я чытаў беларускія кнігі з алоўкам у руках, і кожнае незнаёмае слова падкрэсліваў, пытаўся ў маці, сястры, што яно азначае, шукаў тлумачэнне ў слоўніку. Гаварыць свядома, прынцыпова па-беларуску я пачаў праз паўгода. Тады ж я пачаў шукаць сяброў-аднадумцаў. І мне пашчасціла.

У тыя часы ў калідоры завода “Інтэграл” вісеў стэнд “Таварыства аховы помнікаў”, і аднойчы на ім з’явілася ўлётка, што ў Музеі драўлянага дойлідства адбудзецца суботнік. І я, вядома ж, прыйшоў...

Тады ж я вырашыў паступаць на гістарычны факультэт. Пасля адбылося маё знаёмства з Генадзем Сагановічам, і ўжо потым з Алесем Бяляцкім, Вінцуком Вячоркам, Віктарам Івашкевічам. У інтэрнаце на вуліцы Акадэмічнай збіралася кола такіх свядомых маладых людзей. У рукі патрапіў Ермаловіч, аддрукаваны на папяроснай паперы, забароненыя вершы Янкі Купалы.

— Ва універсітэт Вы паступалі ўжо як талаковец?

— І як камсамолец. На заводзе я быў камсоргам свайго цэха. Я быў чалавекам, які са школьных гадоў цікавіўся грамадскай дзейнасцю. Я свядома запісаўся ў камсамол і браў удзел амаль ва ўсіх школьных камсамольскіх мерапрыемствах. Сястры-студэнтцы я дапамагаў пісаць працы па навуковым камунізме, перачытаў гару літаратуры. Я перахварэў гэтым. Але ж жыццё прымусіла больш цвяроза паглядзець на казачныя камуністычныя ідэі. Маё расчараванне камсамолам прыйшло на заводзе, калі прыходзілася выбіваць узносы, а хлопцы не хацелі аддаваць заробленыя капейкі на непатрэбныя справы. А ўжо поўнае працверажэнне, выздараўленне ад камуністычнай ідэалогіі адбылося пасля Курапатаў, калі адкрыліся жудасці пра рэпрэсіі.

Ва універсітэце прыходзілася, як ледаколу, разбіваць завалы савецкай ідэалогіі. Я адзіны гаварыў у групе і на ўсім курсе па-беларуску, і экзамены здаваў па-беларуску. Нават навуковы камунізм. Чытаў Леніна, і канспекты пісаў па-беларуску. Потым мяне падтрымалі некалькі чалавек. Аднак ва універсітэце не было ніводнага аўтарытэтнага прафесара, якому б я мог давяраць, да якога мог звярнуцца. Ніхто з беларускіх прафесараў не захацеў гаварыць па-беларуску, уключыцца ў перабудову, у нацыянальны рух. Было вельмі крыўдна. Мы ведалі, што адбываецца ў Эстоніі, Літве, Грузіі. Менавіта акадэмічныя колы ўзначальвалі там народныя рухі.

Маё навучанне ва універсітэце ператварылася ў барацьбу, і таму, скончыўшы тры курсы, я перавёўся на завочнае аддзяленне. На першым месцы ўжо быў іншы універсітэт — універсітэт грамадскай беларушчыны.

«Талака» — гэта быў стыль беларускага маладзёжнага жыцця»

— Чым займалася “Талака”? Што для Вас было галоўным?

— Фармальна мы былі клубам аховы помнікаў. Удзельнічалі ў рэстаўрацыі Траецкага прадмесця, Дома Ваньковіча і г.д. Мы працавалі на раскопках пад кіраўніцтвам Зянона Пазьняка, чыталі яго працы. Ягоную кніжку па гісторыі старога Мінска зачытвалі да дзірак.

Па сутнасці “Талака” — гэта быў стыль беларускага маладзёжнага жыцця. Беларушчына была не паказухай, а паўсядзённым існаваннем. Мы былі нефармаламі, анархістамі, і гэта дазволіла нам перамагчы жорсткую сістэму камуністычнага рэжыму. Мы разбуралі яе сваім нахабным маладым непрадказальным анархізмам. І нам трэба было своечасова пераключыцца з гэтага нефармальнага стану і стаць крыху бюракратамі, зарэгістраваць “Талаку”, зрабіць яе рэспубліканскай арганізацыяй і стварыць рэальную канкурэнцыю камсамолу. Магчыма, па-другому б усё закруцілася. Але ніхто нам гэтага не падказаў, а самі не здагадаліся.

З “Талакі” пачынаўся Беларускі Народны Фронт.

— Сёння Вы падтрымліваеце стасункі з Зянонам Пазьняком?

— Калі ён прыязджае ў Вільню, абавязкова сустракаемся. Я вельмі паважліва стаўлюся да Зянона Станіслававіча. Але спрачаюся з ім як з палітыкам. Лічу, што ён не заўсёды мае рацыю, асабліва калі называе нашых дэмакратычных змагароў агентамі Масквы. Я лічу, што нельга кідацца такімі абвінавачаннямі, бо людзі знаходзяцца ў рэальнай палітыцы, робяць рэальную справу, могуць памылядца. І ў сваіх характарыстыках Зянону Станіслававічу трэба быць больш асцярожным, далікатным і неазлобленым.

— Сяржук, чаму, на Ваш погляд, мы так хутка згубілі тое, што ўдалося заваяваць у часы нацыянальна-адраджэнскага руху 1980—1990-х гадоў? Чаго не хапіла, каб захаваць, усталяваць незалежнасць, беларускасць?

— Не хапіла ўмення працаваць, не хапіла волі. Мы зарана расслабіліся, вырашылі, што незалежнасць прыйшла, спраўдзілася і назад дарогі не будзе. Я памятаю, як мы, талакоўцы, з усмешкай глядзелі на мітынгі пачатку 1990 гадоў. Маўляў, ну што гэта за мітынгі, хіба іх можна параўнаць з тымі, якія праводзілі мы ў савецкі час пад пільным вокам КДБ? А якраз у той момант і трэба было прыкладаць шалёныя намаганні, каб захаваць гэта. З’явіліся магчымасці заняць нейкія працоўныя пасады ва ўладзе — трэба было іх займаць. Прывяду адзін красамоўны прыклад. У Літве ў часы аднаўлення незалежнасці герб “Пагоня” быў паўсюль, нават здараліся перахлёсты. Даходзіла да таго, што герб друкавалі нават на пакетах для прадуктаў. Але што ж той пакет — пакарыстаўся і ў сметнік. Дык літоўскі ўрад прыняў адмысловую пастанову, каб рэгламентаваць выкарыстанне паважанага сімвала. У нас такога масавага энтузіязму не было. А нам таксама трэба было друкаваць кніжкі, улёткі, рабіць усё, каб Пагоня прыйшла ў кожную хату, замацавалася ў свядомасці людзей. А такіх кніжак выйшла дзве—тры невялікім накладам. Мы папулярызацыю Пагоні даручылі чыноўнікам-бюракратам, а яны пачапілі герб на свае казённыя дамы і міліцыянерам, якія насілі пагоню па сваіх фуражках.

«У Беларусь трэба вяртацца ўсім, хто калісьці пакінуў Радзіму»

— Сяржук, на Ваш погляд, сённяшні дэмакратычны рух можа здзейсніць перамены на Беларусі ці ўсё ж такі яму чагосьці нестае?

— Не думаю, што сёння ў Беларусі ёсць такія сілы, якія рэальна могуць нешта здзейсніць. Ведаеце, калі часам парэжаш палец, ранка потым доўга загойваецца. Так і ў Беларусі. У свой час на адказную пасаду прэзідэнта мы абралі не таго чалавека. Утварылася вельмі глыбокая рана, многа часу пройдзе, перш чым яна зацягнецца. І, галоўнае, справа ж не толькі ў прэзідэнце. Усе мы, усё беларускае грамадства вельмі моцна інфіцыраваны савецкай ідэалогіяй, вельмі моцна падпалі пад гіпнатычны ўплыў Расіі, мы вельмі баімся пераменаў. Вось калі ўсё зменіцца, разам з намі зменіцца і Беларусь.

Стратэгія ў беларускай апазіцыі павінна быць на доўгія гады. І мне здаюцца памылковымі разважанні, што, маўляў, збяром на плошчы тысячы людзей — і ўсё зменіцца. У Венгрыі ў мінулым годзе сабралася 100 тысяч чалавек, а ўлада не змянілася. Мітынговай дэмакратыяй можна было перамагчы ў мінулым стагоддзі. ...Але час перамен настане. Галоўнае для нас сёння — рабіць грамадскую работу, дапамагаць людзям аб’ядноўвацца, наладжваць інфармацыйныя патокі.

Сёння я па-іншаму гляджу на многія рэчы, змянілася мая канцэпцыя беларушчыны. Раней казалася, што ў нас будзе, як у Літве, мы ўсе пачнем гаварыць па-беларуску, будзем жыць па-беларуску. Але мы адрозніваемся ад літоўцаў, палякаў. У іх заўсёды была адна мова, адна вера, а ў нас некалькі моў, некалькі вер. Мы знаходзімся на пагранічча, на пагранічча цывілізацый, і ў гэтым наша асаблівасць. Мы імкнемся заключаць саюзы, і, па сутнасці, так было заўсёды. Узгадайце Вялікае княства Літоўскае. Але трэба, каб саюзы заключаліся без перакосаў. Калі б мы знайшлі аптымальны варыянт раўнапраўных саюзаў і на ўсходзе, і на захадзе, то і развіваліся б інакш.

— У Вас няма жадання вярнуцца ў Мінск?

— Гэтае жаданне агромністае. І я веру, што яно будзе здзейснена. У Беларусь трэба вяртацца ўсім, хто калісьці пакінуў Радзіму і зараз жыве ў Польшчы, Амерыцы, іншых краінах. Мы патрэбны Беларусі, без нас не адбудзецца тая Беларусь, якая павінна адбыцца. Я пачуваю ў сабе трошку сіл, і мне здаецца, што там я буду больш запатрабаваны як беларускамоўны чалавек, як чалавек, які мае адукацыю гісторыка. Магчыма, мая журналісцкая дзейнасць была б запатрабавана. Магчыма, я мог бы займацца са сляпымі дзецьмі беларускай мовай. І дзеля гэтага я рвуся назад, у Мінск. Хаця праблем многа з пераездам, і перш за ўсё медыцынскіх. Але я думаю, што змагу іх вырашыць...

Марыя ЭЙСМАНТ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 МАЯ 2007 г.

ЧАСТО ЗАДАВАЕМЫЕ ВОПРОСЫ

Объединение РПЦ и РПЦЗ: что это значит?

В праздник Вознесения в храме Христа Спасителя Патриарх Московский и всея Руси Алексий II и патриарх Русской Православной Церкви за границей (РПЦЗ) митрополит Восточно-Американский и Нью-Йоркский Лавр в присутствии десятков архиереев, сотен священнослужителей и мирян Московского патриархата и РПЦЗ подписали Акт о каноническом общении.

Процесс объединения РПЦ и РПЦЗ всегда вызывал много вопросов. Вот ответы на основные вопросы, изложенные РИА "Новости".

Какое значение имеет объединение РПЦ и РПЦЗ?

"Это величайшее событие. Русские люди оказались на высоте того исторического шанса, который им предоставился", — считает зампред комитета Госдумы по международным делам, президент Фонда исторической перспективы Наталья Нарочницкая.

"Мы сделали то духовное усилие, без которого России нельзя дальше существовать. Я с оптимизмом смотрю на этот процесс объединения церкви, верю, что окрепнет внутренний стержень, без которого государство — просто территория с полезными ископаемыми, а нация — это просто народонаселение. Вера превращает народонаселение в нацию", — сказала Нарочницкая.

По ее мнению, очень важно для нации найти внутреннее согласие и устранить разделение, особенно в современных условиях, когда не все страны в мире относятся к России благожелательно.

"Объединение для простых верующих имеет такое же значение, как если бы Монтекки и Капулетти подружились, забыли все бывшие обиды, вместе помолились на гробе Ромео и Джульетты и навсегда осудили институт кровной мести. Какой бы далекой ни казалась эта аналогия, но преодолено ничуть не меньшее средостение. Лучше сейчас не поминать тех слов, которые с двух сторон были сказаны за эти десятилетия. И то, что две части русской Церкви готовы оставить все взаимные обиды позади, есть подлинное чудо Божие", — говорит настоятель храма мученицы Татианы протоиерей Максим Козлов.

В чем заключаются основные противоречия, которые разделяли церкви столько лет?

"Мы разнились в отношении к прошлому России, к путям выживания церкви в условиях тоталитарного режима, в отношениях с неправославным христианским миром... На сегодня в главном понимание по всем этим проблемам достигнуто", — рассказывает протоиерей Максим Козлов. "Разделение не было вызвано вопросами вероучительного характера, а диктовалось по преимуществу внешними и отчасти политическими причинами", — разъясняет доцент МДАиС, заместитель председателя Учебного комитета Русской Православной Церкви архиепископа Верейского Евгения Алексей Светозарский.

Каковы главные доводы противников объединения?

По словам протоиерея Максима Козлова, "главные аргументы противников объединения извне за последние годы были сняты. Они касались прежде всего прославления новомучеников, что состоялось на Юбилейном Архиерейском Соборе 2000 года, и отношений с государством. Эта проблема урегулирована принятием основ социальной концепции РПЦ на том же Соборе, где говорится о принципиальной возможности неподчинения Церкви государству, когда последнее выдвигает требования, противоречащие евангельскому нравственному закону. Третье возражение относилось к экуменической деятельности Московской Патриархии. Острота возражений в значительной мере снята документом того же Собора 2000 года — "Принципы отношения РПЦ к инославию" и выраженной готовностью продолжить дискуссию о необходимости и мере участия Православной Церкви во Всемирном Совете Церквей. На сегодня главным опасением наших зарубежных оппонентов остается страх перед неискренностью побуждений Московской Патриархии. Перед тем, что реально мы руководствуемся внецерковными мотивами. Как правило, эти возражения выдвигают те клирики и миряне зарубежья, которые и в эти годы в России не бывали, и с реальной церковной жизнью нашей не знакомы".

Когда появилась РПЦЗ?

РПЦЗ — Русская Православная Церковь за границей — появилась в результате революции 1917 года и последовавшей за гражданской войной массовой эмиграции из России. В 1927 году произошел окончательный разрыв в общении между Московским патриархатом и РПЦЗ, когда зарубежные иерархи церкви отказались дать обязательство митрополиту Сергию (который впоследствии стал патриархом) в лояльности к советской власти.

В СССР РПЦЗ считалась властями и официальной пропагандой контрреволюционной, антисоветской, монархической, эмигрантской, религиозно-политической группировкой.

Среди представителей зарубежной церкви и сейчас есть те, кто отрицательно относится к объединению РПЦ и РПЦЗ.

У СОСЕДЕЙ

Удаление символов коммунизма

Парламентская фракция правящей в Польше консервативной партии "Право и справедливость" официально внесла в парламент проект закона об удалении символов коммунизма из общественной жизни, сообщил на пресс-конференции в Сейме Польши председатель партии Марек Кухчиньский.

Он также пояснил, что в законопроекте речь идет о названии различных объектов (в том числе названиях улиц), удалении с городских территорий материальных символов коммунизма, а также об отмене орденов и других государственных наград.

"Памятники и все символы коммунистической диктатуры должны исчезнуть как чуждые польской традиции", — сказал министр культуры Польши Казимеж Уяздовский в интервью польской газете Rzeczpospolita. Общаясь с журналистами телеканала TVN24, он подчеркнул, что инициатива его ведомства не направлена против России и Красной Армии, освобождавшей Польшу.

"Речь не идет о том, чтобы не уважать и не ухаживать за могилами солдат Красной Армии. Все могилы достойны уважения", — сказал Уяздовский.

Споры по поводу наследия советского прошлого в Польше возникают не впервые. Несколько лет обсуждали, что делать с Дворцом культуры и науки — сталинской высоткой, которая, по мнению многих поляков, портит вид Варшавы. Однако, в конце концов, высотку решено было не трогать как памятник архитектуры.

По словам пресс-секретаря министерства культуры Яна Каспжика, речь идет только о 30—40 памятниках, которые, согласно законопроекту, могут переставить на кладбища или перенести в музей памятников коммунистического периода в Козловке.

"Действие закона не распространяется на монументы, находящиеся на военных кладбищах", — подчеркнул он.

МЫСЛИ ВСЛУХ

Где же ты, мировой лидер?

Что может принести миру «многополярность», к которой многие политики так стремятся

Пока взоры российских СМИ прикованы к конфликту между президентом и Верховной Радой в Киеве, никто не обращает внимания, что параллельно в Вашингтоне также разворачивается конфликт между президентом и Конгрессом. Конечно, различий между двумя конфликтами тьма. В Вашингтоне нет Майдана. И новое парламентское большинство там не покушается, в отличие от киевского, на полномочия президента. И ни Канада, ни Мексика, ближайшие соседи США, не лелеют втайне надежду, что в результате нынешнего противостояния страна вдруг распадется, скажем, на англоязычные и испаноязычные штаты — и каждой достанется свой кусок.

Тем не менее в вашингтонском конфликте решается нечто несопоставимо более важное, нежели в киевском. В двух словах — возникнет ли в международной политике общепризнанный лидер или поражение американской сверхдержавы на Ближнем Востоке ввергнет мир в пучину анархии?

Этот выбор стоял на протяжении двух столетий, начиная с наполеоновских войн, когда европейская коалиция разгромила французскую сверхдержаву и на месте поверженного Наполеона оказался вдруг новый "Агамемнон Европы", император Александр I. Уже при его наследнике Николае I, однако, оказалось, что Россия претендует вовсе не на лидерство в европейской политике, как при Александре, а на ту же сверхдержавную роль, которую совсем недавно играл Наполеон. Чем кончилось дело, известно. Новая европейская коалиция поставила в Крымской войне на колени и новую сверхдержаву.

А затем в мире, лишенном общепризнанного лидера, началась эпоха "многополярности", которая, естественно, закончилась тем, чем только и могла закончиться международная анархия, — всеобщей дракой, мировой войной. После войны Америка ушла в глухую изоляцию, а кондомениум Англии и Франции не справился ни с ролью новой сверхдержавы, ни с ролью общепризнанного лидера. В результате снова наступил "многополярный" хаос, и он, опять-таки естественно, закончился новой мировой войной, в ходе которой сверхдержавой оказалась Германия.

После Второй мировой войны обязанность не допустить новой анархии, то есть "многополярного" мира, взяли на себя в шаткой структуре конфронтационной биполярности США и СССР. Помимо перманентного риска, связанного с возможным просчетом лидеров, в распоряжении которых были армады ядерных ракет, способных испепелить мир, уязвимость этой новой конструкции состояла в том, что в конце концов одна из двух сверхдержав должна была дать слабину — и развалиться. Что и случилось.

А что потом? А потом настал момент истины. Впервые за два столетия забрезжила надежда, что может быть положен конец этой затянувшейся на пятнадцать поколений круговерти, в которой каждую поверженную "однополярную" сверхдержаву сменяли либо конкурирующая сверхдержава, либо "многополярная" анархия. Победитель в третьей за один век, пусть на этот раз и "холодной", войне мог позволить себе роскошь выбрать между двумя одинаково возможными для него ролями.

В первой из них Соединенные Штаты, опираясь на свою экстраординарную экономическую и военную мощь, раз и навсегда избавили бы мир от всей этой измучившей его "однополярно-многополярно й" контроверзы. Для этого Америке нужно было стать мировым лидером, гарантом неписаной конвенции, обязывающей все народы соблюдать общепризнанные правила игры.

Правил этих на самом деле немного. Нельзя, например, нарушать режим нераспространения ядерного оружия. Особенно тем правительствам, которые спонсируют международных террористов, мечтающих этим оружием завладеть. Нельзя проводить этнические чистки, жертвами которых становятся сотни тысяч, порою миллионы людей, повинных лишь в том, что исповедуют другую веру или принадлежат к другой расе. Нельзя захватывать другие страны. И так далее.

В такой структуре мировой политики роль лидера заключалась бы в том, чтобы возглавлять международное сообщество (или хотя бы самую влиятельную его часть) в борьбе с нарушителями этой конвенции.

Вторая возможная роль была проще и привычнее: США могли остаться сверхдержавой и, как некогда Франция, Россия или Германия, попытаться навязать миру свои правила игры. Согласитесь, что разница между двумя этими ролями решающая.

Следует отдать Америке должное: на протяжении целого десятилетия она колебалась между этими ролями. При Буше-старшем и при Клинтоне она даже, казалось, склонялась к роли мирового лидера. Ей не все удавалось в этой новой для себя — и для мира — роли. Она не нашла в себе силы организовать новый план Маршалла, чтобы помочь России в самый трудный ее час шоковой терапии. Она не смогла остановить межплеменную резню в Руанде и хаос в Сомали. Она прозевала превращение Индии и Пакистана в ядерные державы (к счастью, ни один из нарушителей не был спонсором международного терроризма).

И все-таки чего-то Америка в этой роли добилась. Когда Саддам Хусейн захватил Кувейт, она сумела создать международную коалицию, которая его оттуда вышибла. Когда "балканский мясник" Милошевич, преследуя безумную мечту о Великой Сербии, устроил сначала кровавую бойню в Боснии, а затем этническую чистку в Косово, руки ему укоротили.

С приходом в Белый дом Буша-младшего, однако, все изменилось, колебания кончились. Новый президент сделал выбор в пользу сверхдержавности. И, конечно, был за него наказан — отчуждением ближайших союзников, валом антиамериканизма, тотчас обретшего наглых и вульгарных лидеров в лице Чавеса в Венесуэле и Ахмадинежада в Иране, и, главное, страшной угрозой полного распада режима нераспространения ядерного оружия.

Я не говорю уже о том, что Америка намертво застряла посреди пожарища гражданской войны в Ираке.

Такова вкратце предыстория вашингтонского конфликта. На поверхности он выглядит как борьба между президентом, до сих пор мечтающим о невозможной "победе в Ираке", и новым демократическим большинством в Конгрессе, отчаянно пытающимся вытащить Америку из болота, где она увязла в результате сверхдержавного выбора ее президента.

Все это, однако, на поверхности вашингтонского конфликта. Суть его куда глубже. Ибо на самом деле в Ираке терпит сейчас поражение сверхдержавный выбор Буша. И многие демократы уже понимают, что им предстоит изменить не только курс его внешней политики, но и самую роль Америки в современном мире. Дать ей возможность сделать вторую попытку отказа от сверхдержавности в пользу мирового лидерства. В конце концов преимущество демократии не в том, что она не делает ошибок, но в том, что она умеет их исправлять.

Конечно, если демократам это удастся, то все усилия по возрождению международной анархии ("многополярного" мира), кем бы они ни предпринимались, окажутся потраченными впустую. Но зато заколдованный круг сменявших друг друга сверхдержавности и анархии, который преследовал человечество на протяжении пятнадцати поколений, будет прорван.

Александр ЯНОВ.

НОВОСТИ СНГ

Даешь третий срок!

О внесении поправок в Конституцию в Казахстане говорили давно. Утверждалось, что якобы для расширения полномочий парламента. И вот парламент страны одобрил законопроект. Оказалось, как и ожидалось, он дает возможность действующему главе страны Нурсултану Назарбаеву занимать пост президента и после истечения двух сроков, сообщает "Интерфакс".

Верхняя и нижняя палаты казахского парламента согласились внести в Конституцию поправки, согласно которым срок полномочий Назарбаева на посту президента будет неограниченным. Однако эта норма будет действовать лишь в отношении Назарбаева, его преемник на посту президента сможет руководить Казахстаном не более двух сроков. Правда, согласится ли с этим преемник? Кроме того, срок президентского правления в республике сокращается после 2012 года с 7 до 5 лет.

Аплодисментов не надо!

Президент Всемирного банка Пол Вулфовиц подал в отставку со своего поста, сообщает AFP. Уходит, по меркам СНГ, вроде бы из-за пустяка. По словам Вулфовица, он покинет свой пост "в интересах банка" в конце финансового года, то есть 30 июня 2007 года.

Причиной отставки стал скандал, в результате которого выяснилось, что президент банка необоснованно продвигал по карьерной лестнице свою подчиненную Шаху Ризу. Пол Вулфовиц повысил женщине, с которой его связывали романтические отношения, зарплату.

Для расследования этого дела была создана специальная комиссия банка, которая пришла к выводу, что Вулфовиц нарушил этический кодекс финансового учреждения. Члены комиссии рекомендовали совету директоров Всемирного банка уволить Вулфовица.



Первое решение Саркози

Новый президент Франции Николя Саркози призвал вывести Европейский Союз из "паралича", в котором он оказался после провала референдумов в отношении европейской конституции.

Французский лидер сказал об этом во время визита в Германию. Это его первая иностранная поездка, она состоялась в день вступления в должность президента страны.

После вступления в должность Саркози заявил, что своим первым президентским решением он предписал всем школам Франции прочесть своим ученикам письмо бойца французского Сопротивления, написанное им перед казнью в 1941 году. Президент признался, что письмо Ги Моке всегда глубоко трогало его, и отметил, что школьники должны знать об ужасе и варварстве войны.

ПОСТОЯННО СПРАШИВАЮТ

Как устроены туалеты для космонавтов?

Рассказывают, что при посещении американского центра подготовки астронавтов муж английской королевы принц Филипп как-то поинтересовался, как быть с "естественными отправлениями" в космосе. Как все-таки космонавты ходят в туалет? Об этом сообщает Би-Би-Си.

Унитаз в космических туалетах выглядит примерно так же, как на Земле, но имеет ряд конструктивных особенностей. В нем предусмотрены специальные крепления для ног, чтобы не оторваться от сиденья. Само сиденье плотно подогнано по форме ягодиц астронавта.

На шаттле, кстати, можно мочиться стоя — как мужчинам, так и женщинам. Для этого разработана специальная воронка со шлангом, который подсоединяется к унитазу. При желании ею можно пользоваться и сидя.

Система канализации отделяет твердые отходы от жидких. Твердые прессуются, хранятся на борту шаттла, а после посадки выгружаются. Жидкие отходы пока просто выбрасываются в открытый космос, но со временем в НАСА надеются найти способ перерабатывать их вторично.

Как говорят специалисты Гвельфского университета в Канаде, это будет особенно необходимо для длительных космических полетов в будущем, в частности, на Марс.

Воздух из туалетов на шаттле перед попаданием в жилые помещения фильтруется для очистки от бактерий и запаха.

На Международной космической станции общий принцип работы системы тот же. В унитаз вмонтированы мощные воздушные насосы. Все отходы сортируются и какое-то время хранятся на борту. Моча всасывается и собирается в 20-литровые контейнеры. Эти контейнеры затем перегружаются на грузовые космические корабли "Прогресс", которые сгорают при входе в верхние слои атмосферы.

Для твердых отходов используются специальные сетчатые пластиковые мешки. Через отверстия проходит поток воздуха, и в результате все экскременты оказываются в мешке. Эластичный пакет стягивается и сбрасывается в металлический контейнер. Контейнеры с отходами также вывозятся "Прогрессом".

Во время запуска и приземления астронавты надевают подгузники для взрослых. К этому пришли методом проб и ошибок — один астронавт в своих воспоминаниях рассказывает, что однажды на заре космической эры запуск долго задерживался, и ему в конце концов разрешили помочиться в скафандр, что сбило все датчики.

А супруг королевы Великобритании не единственный, кто обращается к специалистам НАСА с вопросами про космические туалеты. В космическом агентстве подтверждают, что дети и журналисты постоянно задают этот вопрос.

ФОТОВЗГЛЯД

Южнокорейские фермеры протестуют против соглашения о свободной торговле с США.

Индуисты молятся на берегу священной для них реки Ганг в Аллахабаде.

В Южной Корее прошла первая общенациональная учебная тревога на случай землетрясения.

В этом году на традиционном эдинбургском театральном фестивале впервые появилась гастрономическая программа.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 МАЯ 2007 г.

ЖЫВАЯ НАТУРА

Хросны ход Алеся Касача

“Стараю партыю ”Жывем па законах Божых", у якую няма неабходнасці ўступаць, дастаткова жыць па законах Божых. Членства ў іншых партыях або дзяржаўная служба — не перашкода. Партыйныя тэзісы: 2007 — год цвярозасці.

Ужо цікава, ці не так? Большасць, канечне, прачытае і пойдзе па сваіх справах, усміхаючыся. Мне не смешна, бо аўтара гэтай улеткі я ведаю 17 гадоў. Таксама ведаю, што стаіць за гэтымі не вельмі гламурнымі словамі і сказамі.

Пачатак адліку

1992 год. Салодкі час спадзяванняў, якія не збудуцца. Мараў, якія аказаліся дарэмнымі. Час адкрытых спрэчак, час свабоды і “Свабоды”. Жыццё было галоднае, але надзвычай цікавае. Сёння прыходзіцца вырашаць, што лепш: быць галодным, але жыць поўным жыццём або быць сытым і ўрэшце вярнуцца да вечнага славянскага пытання — ну а што далей?

У гэты ж прыкладна час я пазнаёміўся з Алесем Касачом, былым таксістам і будучым фермерам. Пачынаў ён так. Спачатку проста лаяльна прасіў зямлю. Не давалі. Тады ён стаў прасіць громка. Паставіў палатку на плошчы Незалежнасці і распачаў галадоўку. Міліцыя спрабавала выкінуць палатку разам з яе ўладальнікам са знакавага месца — Алесь абліў палатку бензінам і папярэдзіў: “Падпалю!” Адсталі. Далей быў суд — апраўдальны прыгавор (тады такое яшчэ было магчыма). Праз Станіслава Шушкевіча пытанне з зямлёю вырашылася станоўча: далі 70 гектараў. Яшчэ 60 ён выпрасіў у арэнду. Жыццё ўдалося? На першы погляд.

Пачаўся адносна спакойны, так бы мовіць, канструктыўны перыяд у жыцці цяпер ужо фермера Алеся Касача. “Маёнтак” размяшчаўся ў Любанскім раёне, на радзіме Алеся (ён і зараз там, ды час другі). Гаспадарка разам з гаспадаром даволі хутка ўставала з чатырох канечнасцяў на дзве нагі. Тут трэба сказаць, што Касач — чалавек нецярплівы, неспакойны. Сам сябе характарызуе так: “Я халерык”. Гаспадарчыя ідэі ў яго галаве ўзнікаюць з рэгулярнасцю ўзыходу сонца. Іншы раз было зайздросна. Справа набірала ход. Толькі, як вядома, за 1992-м годам быў 1993-і, а потым — 1994-ы...

Хтосьці лічыць яго пераломным. І гэта так: вельмі многіх ён пераламаў праз калена, многіх прымусіў сысці ў падполле, у духоўны андэграўнд. У чарговы раз мы з Алесем сустрэліся ўжо ў 1995-м. На жаль, не па самай лепшай прычыне. Нічога дзіўнага, такія людзі самі прыцягваюць да сябе непрыемнасці.

«Чорная паласа» чорна-белага жыцця

5 кастрычніка 1994 года прэзідэнт выдаў указ №135. Хто яго можа памятаць? Думаю, Касач яго памятае вельмі добра. З гэтага дакумента ў яго пачаліся, мякка кажучы, непрыемнасці, якія дагэтуль ніяк не скончацца.

Між іншым указ проста забараняў разлік наяўнымі грашыма паміж юрыдычнымі асобамі. Правільны дакумент быў, своечасовы. Бо, як вядома, наяўныя грошы маюць уласцівасць прыліпаць да чалавечых рук.

Але і фермер, і старшыня калгаса, у якога Алесь купіў свіней, пра яго даведаліся са спазненнем. Прэзідэнт пачаў барацьбу з карупцыяй, на хвалі якой трапіў на сваю пасаду і з якой змагаецца дагэтуль. Што атрымалася ў выніку? У выніку фермер і трапіў на 538 мільёнаў 482 тысячы 960 рублёў, на столькі яго аштрафавалі падаткавікі. Старшыня ж калгаса паехаў у Мінск, паплакаў, дзе трэба, і “адмазаўся”. Такім чынам, з самага пачатку стала зразумелым, з кім Аляксандр Рыгоравіч пачаў барацьбу на самай справе. Што потым пацвердзілася, пацвярджаецца і будзе пацвярджацца надалей. Тут без варыянтаў.

Цікава нагадаць схему, па якой “зрабілі” Алеся. Справа мінулая. Па-першае, на момант здзелкі ён не з’яўляўся юрыдычнай асобай, што суд не заўважыў. Натуральна. Па-другое, суд вырашыў спагнаць частку штрафу шляхам канфіскацыі часткі тэхнікі і яе продажу.

Прыехалі судовыя выканаўцы, падаткавікі і міліцыя. Алесь быў у Любані.

Была яго жонка Галіна, пры ёй і забралі Т-25 і ГАЗ-53. Цікава, што міліцыянеры раілі Галіне акт не падпісваць. Яшчэ больш цікава тое, што тэхніка належала не Алесю, а яго сястры Валянціне Янушкевіч. Тлумачу: было дзве гаспадаркі — “Касач” і “Янушкевіч” — яны зліліся, і ўтварылася ТАА “Айрыс-сервіс”. Укладам сястры ў статутны фонд былі трактар і аўто. Алесю прыйшлося наматаць не адзін дзесятак кіламетраў у спробах здабыць даведку аб тым, што ён проста асоба, а не юрыдычная.

Алесю Касачу гэтая няшчасная даведка снілася па начах. Яе адсутнасць перакрэслівала ўсе планы і не давала шанцаў на будучае. Ён верыў, што паперка вырашыць усе праблемы, і не задумваўся над простым: калі яго вырашылі “закрыць”, то зробяць гэта. Пры гэтым фермер быў вінен банку 300 мільёнаў крэдыту — яшчэ 300 — у якасці працэнтаў. Гэтую суму Алесь выплаціць мог бы, але паўмільярдны штраф мяняў усю карціну. Яшчэ тады мне падумалася: гэтыя выплаты падкосяць гаспадарку пад корань.

Што рабіць? Зноў заняцца палітыкай. Хаця лепш было б — юрыспрудэнцыяй. Так я тады лічыў. А сёння бяру свае словы назад. Улада прыняла рашэнне: фермера Алеся Касача ў прыродзе існаваць не павінна. І паслядоўна сваё рашэнне выконвала. Пры чым тут юрыспрудэнцыя, і як яна дапаможа? Супраць лому няма прыёму, калі няма другога лому. Значыць, палічыў Алесь, трэба брацца за лом, пратэставаць адкрыта, іначай не заўважаць.

14 мая 1995 года фермер аперазаўся ручніком з выявай бусла, сімвала роднай хаты, і ўзяў удзел у шэсці апазіцыі. Тады яшчэ было можна, тады яшчэ давалі. Алесю і далі крыху пахадзіць, а потым кінулі ў “варанок”. На гэтым акцыя пратэсту скончылася.

У рэшце рэшт даведку Алесю ўсё ж далі. Пры гэтым, праўда, канфіскавалі яшчэ адну машыну і яшчэ адзін трактар. На дэсерт прыйшоў адказ з Адміністрацыі прэзідэнта: ліст фермера пераслалі ў аблвыканкам. Што і патрабавалася даказаць, усё вяртаецца на кругі свае.

Ля разбітых начовак

Прайшло столькі гадоў, а свайго героя я ідэнтыфікаваў метраў за 200, калі ён ішоў ад прыпынку. Ні з кім не зблытаеш.

— Я цябе таксама здалёк пазнаў, — смяецца. — Рыбак рыбака...

Пасівеў, стрыжка модная — мінімум валасоў, стаў больш стрыманым, аднак у цэлым — усё той жа халерык. Толькі вочы сумныя. Хто ён цяпер, я так да канца і не зразумеў. Здаецца, фермер; як быццам, валодае 130 гектарамі зямлі. З другога боку, раённая ўлада гэтую зямлю спрабуе адабраць. Увогуле, ён і не фермер, аказваецца, бо рэгістрацыю не прайшоў. Знаёмая, распаўсюджаная сітуацыя.

— Ты мне растлумач, — прашу, — зямля чыя? Калгасная ці твая?

— Ужо не мая, — зноў смяецца. — Але — мая, я там сею. СВК сваю зямлю апрацаваць не можа як след. Старшыня сам кажа: мне твая зямля не трэба. Я з ім дамаўляюся, ён мне засявае. А даглядаць-убіраць — гэта ты сам рабі. Сею крыху збожжавых, крыху бульбы, астатняе і шматгадовыя травы. У мяне ж коней амаль 40!

Такім чынам, Касач нібы існуе, а нібы і не. Мне ўсё ж здаецца, што існуе, бо мы сядзім на скамейцы і размаўляем. Вось — улётку ён сачыніў, а я яе яшчэ крыху працытую. Напрыклад: “Зварот да сродкаў масавай інфармацыі. Я прасіў бы паказаць маё жыццё, маю працу на зямлі. А таксама паказаць, як раённыя ўлады жывуць не па законе. Як нават кіраўнік раёна на ганаровай трапезе пры адкрыцці царквы ў вёсцы Дарасіна, куды мяне запрасілі, шаноўны спадар Грыбанаў дакладваў уладыку Філарэту аб тым, што яго ўзнагародзў прэзідэнт за поспехі ў намалоце збожжа. Мне было сорамна — за яго, і за прэзідэнта. Так і хацеў сказаць: ”Пабойся Бога. Тыя сотні тон кукурузы, што згнілі ў буртах, — гэта не поспех, а грэх...”

Вось цяпер бачна, што Алесь Касач не змяніўся. Усё такі ж праўдашукальнік — змагар за справядлівасць і разумны сэнс, якога ў нашым жыцці ўсё менш. Дый пазнавата мяняцца ў 49 гадоў. Чалавеку пабочнаму ён можа падацца не зусім адэкватным, але гэта не так. Эрых Фром дакладна апісаў падобную сітуацыю. Калі чалавек выходзіць за межы агульнапрынятага, то яго “прызначаюць” неадэкватным. Проста і зручна. Асноўная трагедыя такіх людзей у тым, што яны вось такія і іншымі быць не могуць. Для іх няма дылемы: заставацца сабою або мімікрыраваць у адпаведнасці з сённяшнімі абставінамі. У іх не атрымліваецца прыстасавацца.

Хаця гэта цяжка. Мала хто вытрымлівае жыццё ў пастаянным форс-мажоры. Ламаюцца. І Алесь быў да гэтага блізкі. Што было, тое было.

Запіў. Але ўзяў сябе ў рукі, кінуў. Паверыў у Бога. Грунтоўна паверыў, як і ва ўсё, што робіць. Дарэчы, з Богам звязана апошняя прыгода Касача.

Дон Кіхот і Галгофа

Думаю, многія памятаюць перформанс, зроблены другім Алесем, мастаком Пушкіным. Ён прывёз тачку гною да Адміністрацыі прэзідэнта і акуратна там яе вываліў. Прэса любіць такія акцыі: усё ж такі вядомы чалавек, ёсць аб чым пісаць. Напрыклад, аб грамадзянскай пазіцыі, мужнасці і г.д. Хаця часта за гэтым няма нічога, апрача жадання нагадаць пра сябе, любага. Рэклама, карацей кажучы.

25 красавіка гэтага года Алесь Касач таксама ажыццявіў свой “перформанс”.

Праўда, думкі папіярыць у яго не было, а быў проста адчай. Ні афіцыйныя, ні неафіцыйныя СМІ акцыі не заўважылі. Так што якая там рэклама... Вымушаны гэты недахоп ліквідаваць. Краіна павінна ведаць сваіх герояў. Існых, а не прызначаных.

Такім чынам, Алесь прымацаваў на плечы драўляны крыж. Ад Кафедральнага сабора рушыў на плошчу Незалежнасці. Мэта была такая: дабрацца да плошчы і пабываць на месцы, дзе калісь стаяла яго палатка.

Чым не перформанс? А звышмэтай адпаведна было жаданне прыцягнуць увагу да сябе і не толькі. У 1991 годзе гэта спрацавала, дый міліцыя не ведала, што рабіць з “пратэстантамі”. Затое цяпер яна ведае гэта вельмі добра. Алесю далі дайсці да “рэжымнай” Кастрычніцкай плошчы. Спынілі, аднеслі разам з крыжом у бок — паабяцалі: “Мы цябе разапнем на гэтым крыжы”. Потым была паездка ў Кастрычніцкі РУУС, пагрозы, выклік псіхбрыгады. Яна Касача агледзела і параіла міліцыянерам выклікаць звычайную “хуткую”, бо сэрца ў затрыманага хворае. Нарэшце Алеся адвезлі ў абласную бальніцу, аказалі дапамогу. Пасля бальніцы Касач вярнуўся на Кастрычніцкую плошчу. Пачаўся другі раунд.

На плошчы, само сабою, яго зноў узялі “пад белы рукі”, пасадзілі ў машыну і павезлі немаведама куды. Спачатку пагражалі забіць. “Няма сэнсу мяне палохаць, смерці я не баюся”, — супакоіў міліцыянераў арыштант. Штосьці было ў яго вачах, яму паверылі. Доўга вазілі, высадзілі ў раёне Курапат. З палёгкай уздыхнулі: “Ну, цяпер да канца дзяжурства на плошчу ён не трапіць”. І памыліліся.

Паблукаўшы па Курапатах, Алесь выпадкова знайшоў яшчэ адзін крыж. З ім у абдымку ён правёў ноч ля Кафедральнага сабора, а ранкам трагікамедыя аднавілася. Наступіла апошняя дзея. Трагікамедыя ператварылася ў трагедыю. Зноў Кастрычніцкі РУУС, зноў выклік псіхбрыгады, збіццё, і як лагічны вынік 26-е аддзяленне санаторыя “Незабудка”, як пяшчотна называюць у народзе псіхбальніцу ў Навінках.

Алеся прымусілі выпіць таблетку, пасля якой ён не толькі хадзіць, але і гаварыць не мог. Толькі на наступныя суткі з вялікімі цяжкасцямі яго забраў сын.

Некалі мне прыйшлося займацца высвятленнем метадаў карнай псіхіятрыі. Дарэчы, гэта было ў той час, калі мы пазнаёміліся — хто б мог падумаць... Дык вось, метады гранічна простыя: аб’яўляем грамадзяніна К. псіхічна хворым, кладзем у бальніцу, ставім на ўлік. Усё, чалавека, па сутнасці, няма. Ён недзеяздольны, таму перапіску з ім усе дзяржаўныя ўстановы спыняюць. На ўлік у псіхдыспансер вас маглі паставіць ананімна, не паведамляючы вам. Здаецца, сёння, згодна з заканадаўствам, вы не можаце трапіць у бальніцу без вашай згоды. Аказваецца, можаце вельмі лёгка. Міліцыя гэта даўно практыкуе, калі не хоча лішніх клопатаў. Так што нічога новага, гэта мы ўжо праходзілі і праходзім зноў толькі па прычыне ўласнай дурасці, абыякавасці і святой веры ў тое, што “са мною такога быць не можа”. Прывітанне з краіны, якой няма.

«Чорная дзірка»

Добра, а што далей? У чым віна існуючага-неіснуючага фермера Алеся Касача? Чаму і каму ён так моцна перашкаджае? Навошта з яго так старанна лепяць “ворага народа”?

А, разумею. У 2006 годзе бюджэтныя ўліванні ў Аграпрам склалі фантастычную суму — 8,2 трыльёна рублёў. Прыбытак атрымаўся крыху незразумелым, усяго 500 млн долараў. Яшчэ лічба: да 2010 года на будаўніцтва аграгарадкоў запланавана выдзеліць 69,7 трыльёна рублёў. Сэрца спыняецца ад такіх касмічных маштабаў паказухі, бо аплачваць яе прыйдзецца нам з вамі.

Вядомы эканаміст Яраслаў Раманчук падлічыў, што пры такім фінансаванні ў Беларусі павінны быць самыя танныя прадукты харчавання. Скажам, свініна па 3 тысячы за кіло, курацінa па 1 тысячы, а бульба ўвогуле па 100 рублёў. Я б толькі дадаў ад сябе тое, што не стаў пісаць Раманчук: такія цэны маглі б сапраўды быць, калі б была нармальная рынкавая эканоміка. Сёння нават не абцяжаранаму спецыяльнымі ведамі абывацелю ясна, што ў аграрнай галіне краіна заведзена ў лабірынт, з якога выбрацца не можа. Як не нагадаць афарызм прафесара Гальданскага: зваротнае выйсце шукайце праз уваход.

І вось пытанне: чаго хоча фермер Алесь Касач? Ды нічога такога, ні мільярдаў, ні трыльёнаў. Не хоча, бо прыйдзецца аддаваць з працэнтамі. А старшыня СВК пра гэта не вельмі задумваецца. У яго задача другая — выканаць прагнозныя паказчыкі. Грошы яму дзяржава дае менавіта для гэтага. І ў колькі абыдуцца гэтыя паказчыкі, асабліва нікога не хвалюе. Тым і адрозніваецца прыватнік ад дзяржаўніка.

Не, ад крэдытаў Алесь бы не адмовіўся, каб зноў устаць на ногі. Пры гэтым ён бы іх вярнуў. І свініна ў яго была б танная, і курацінa, і бульба. Такая ўжо асаблівасць у прыватніка, што ў яго ўсё выходзіць лепш. Па той прычыне, што... Стоп. Хопіць. Мне надакучыла выкладаць гэты “лікбез”, а вам яго чытаць. Спынімся вось на чым. Ёсць чалавек. Яго завуць Алесь Касач. Ён можа і хоча рабіць сваю справу без бізуна і перніка. Толькі яму не даюць, бо небяспечны чалавек. Нават сімвалічна, што “хросны ход” завяршыўся ў Кастрычніцкім РУУС, дзе пачалася турэмная эпапея Аляксандра Казуліна. Вы лічыце, што гэта розныя вагавыя катэгорыі, што аўтар зблытаў божы дар з яечняй? Катэгорыі розныя, а каманда адна. Казулін і Касач уладзе не патрэбны. Яны яе палохаюць. Таму адзін — у калоніі, а другі — з крыжом на плячах.

Гэтыя двое не ўпісваюцца ў маўклівы статак, які без перніка і бізуна жыць не ўмее. Дый не хоча. Тыповы беларускі пейзаж — дрыгва, якая ўцягвае ў сябе людзей, іх мары, спадзяванні, планы — усё уцягвае. Але тое, што такія людзі яшчэ існуюць, дае падставу не чакаць варагаў. Як-небудзь самі, з малітваю, як кажуць.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

СТАЛІЦА

Рэчавых рынкаў наогул не будзе

З 22 сталічных рынкаў пяць атэставаныя ўмоўна. Пра гэта паведаміў начальнік аддзела гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Аляксандр Лукашэвіч.

Сярод умоўна атэставаных рынкаў — рынак у Шабанах, “Чыжоўскі”, “Курасоўшчынскі”, “Чэрвенскі” і “Гандлёвыя рады” (рынак Белкаапсаюза).

Паводле слоў А.Лукашэвіча, атэстацыя рынкаў праводзіцца трэці год запар, і трэці год гэтыя рынкі прызнаюцца ўмоўна атэставанымі. На думку рабочай групы Мінгарвыканкама, яны не адпавядаюць статусу сталічных рынкаў.

Як зазначыў А.Лукашэвіч, рынкі ў Мінску паступова будуць пераходзіць на гандаль толькі прадуктамі харчавання і сельгаспрадукцыяй, а гандлёвыя месцы па продажы нехарчовай прадукцыі будуць пераводзіцца ў гандлёвыя цэнтры і магазіны.

Да ведама. Праектная магутнасць усіх рынкаў сталіцы складае 12 тысяч 300 месцаў, але на цяперашні момант на рынках задзейнічана 11 тысяч 800 месцаў. Аб’ём рознічнага гандлю ў 2006 годзе на рынках горада склаў 3 трыльёны 194 мільярды рублёў.

Марына НОСАВА.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Радзькову ўказана

А чацвёра дзеячаў, якія спакусіліся на творы Гілевіча, Барадуліна і іншых вядомых пісьменнікаў, звольнены

Кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) атрымала адказ на скаргу ў Пракуратуру Рэспублікі Беларусь, што тычылася мінулагодняга распараджэння міністра адукацыі Аляксандра Радзькова кіраўнікам структур і ўстаноў адукацыі *“па недапушчэнні правядзення ва ўстановах адукацыі мерапрыемстваў па лініі грамадскага аб’яднання ”Саюз беларускіх пісьменнікаў”.*

У адказе сярод іншага адзначаецца, што скарга *“накіравана міністру адукацыі з просьбай скарэкціраваць раней дадзенае ім указанне адносна дзейнасці ГА ”Саюз беларускіх пісьменнікаў" з улікам патрабаванняў заканадаўства".*

Нагадаем, што паводле распараджэння Мінадукацыі *“ў мэтах прапаганды мастацкай літаратуры, арганізацыі эфектыўнай працы па ідэалагічным і духоўным выхаванні вучнёўскай і студэнцкай моладзі даручаецца забяспечыць правядзенне творчых сустрэч з пісьменнікамі і іншых культурна-масавых мерапрыемстваў з іх удзелам толькі па ўзгадненні з грамадскім аб’яднаннем ”Саюз пісьменнікаў Беларусі"* — таго самага праўладнага чаргінцоўскага саюза.

Як паведаміў старшыня СПБ Алесь Пашкевіч, управа рады Саюза беларускіх пісьменнікаў таксама аспрэчыла запланаваныя ўладамі змены ў школьных праграмах па беларускай літаратуры, у якіх між іншым меркавалася *“гранічна мінімізаваць змест манаграфічных тэм, прысвечаных творчасці народных паэтаў Беларусі Ніла Гілевіча і Рыгора Барадуліна”, “выключыць са спіса літаратуры для вывучэння і пазакласнага чытання творы Святланы Алексіевіч, Сяргея Законнікава, Вольгі Іпатавай, Уладзіміра Арлова, Міхася Скоблы, Вітаўта Чаропкі і іншых апазіцыйна настроеных пісьменнікаў”*, а *“пры вывучэнні творчасці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы выключыць п’есу ”Тутэйшыя".* Паводле слоў старшыні СБП, на сённяшні дзень гэтыя змены, аб якіх стала вядома з публікацый у Інтэрнеце, “замарожаныя”.

Разам з тым стала вядома, што звольнены з працы чатыры чыноўнікі і спецыялісты Мінадукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі, якія мелі дачыненне да распрацоўкі запланаваных змен у праграмах па беларускай літаратуры. І ўсё ж сябры рады СБП настроены не вельмі аптымістычна, яны лічаць, што “чыстка праграм” будзе ажыццяўляцца, але больш сакрэтна. Па крайняй меры, пра гэта сведчыць змест праграмы для абітурыентаў ВНУ па беларускай літаратуры, з якой выкраслены многія творы выбітных беларускіх літаратараў.

Марат ГАРАВЫ.

ТОЛЬКО ЦИФРЫ

На сигареты минчане тратят больше, чем на овощи и фрукты

По данным Минского городского управления статистики, в 2005 году на приобретение табака жители столицы потратили 96,1 миллиарда рублей. В то время как на рыбу и морепродукты — 79,9 миллиарда, на овощи и фрукты — 78,9 миллиарда.

В 2006 году 45% от общего количества расходов минчан составили расходы на непродовольственные товары, из них 2% — на табачные изделия. Для сравнения: расходы на спорттовары (за исключением одежды) составили только 0,2%.

Соб.инф.

БАНКРОТ

Укладчыкам «Джэм-Банка» вернуць грошы

Фізічныя асобы — укладчыкі “Джэм-Банка” ў чэрвені змогуць атрымаць свае зберажэнні. Пра гэта паведаміла ўпраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка.

11 мая Вышэйшы Гаспадарчы суд краіны прызнаў “Джэм-Банк” банкротам, у адносінах да яго адчынена ліквідацыйная вытворчасць. Першымі пасля распродажу маёмасці банка свае грошы будуць атрымліваць фізічныя асобы.

Банк існаваў у Беларусі з 1991 года.

Ул.інф.

ЗДАРЭННЕ

Манашкі знайшлі труп

У Гомелі ў двары Дома міласэрнасці манахінь ордэна Маці Тэрэзы ў пяць гадзін раніцы быў знойдзены труп мужчыны.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, асоба мужчыны і прычыны смерці ўстаноўленыя. Мясцовы жыхар 1962 года нараджэння памёр ад страты крыві. Па адной з версій мясцовых аператыўнікаў, мужчыне маглі нанесці раненні “асобы, якія вядуць бадзяжны лад жыцця”.

Як паведаміў агенцтву адзін з пастаяльцаў Дома міласэрнасці, загінуўшы мужчына раней часта начаваў у альтанцы на тэрыторыі манастыра. *“Мы яго звалі Таварыш генерал. Ён раней ваенным быў, жыў у Прудку, а сваякі выгналі няшчаснага. А ён жа, нябожчык, зусім бяскрыўдны быў, нікога не чапаў”*, — патлумачыў пастаялец Дома міласэрнасці.

Манахіні ордэна Маці Тэрэзы займаюцца дабрачыннай дзейнасцю — даглядаюць хворых, кормяць маламаёмных. Штодзённа прыкладна 150 чалавек прыходзяць да іх на бясплатныя абеды. Таксама сёстры дапамагаюць бедным адзеннем і прадуктамі.

Паводле слоў аператыўнікаў, цяпер вядзецца следства, распачата крымінальная справа па арт.147 (нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, што пацягнула смерць пацярпелага) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

КРЫМІНАЛ

Бога не баяцца

Па Мінскай вобласці пракацілася хваля крадзяжоў з культавых устаноў.

З касцёла ў вёсцы Канстанцінава Мядзельскага раёна былі выкрадзены чатыры іконы. Злачынца трапіў у памяшканне, распілаваўшы металічныя краты акна. З царквы Благавешчання Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Забрэззе Валожынскага раёна былі выкрадзены ўжо дзевяць ікон. Невядомы трапіў у памяшканне храма, узламаўшы замок. Тры іконы былі выкрадзены з касцёла ў вёсцы Альковічы Вілейскага раёна. Злачынца пранік у будынак, разбіўшы шыбу...

Расследаванне справы аб крадзяжах з культавых устаноў асабіста кантралюе начальнік УУС Мінаблвыканкама Іван Сяргей. *“Крадзяжы з культавых устаноў былі ўчынены дастаткова кваліфікавана, да злачынстваў загадзя рыхтаваліся,* — заявіў ён. — *На тэрыторыі вобласці, а магчыма, і рэспублікі, дзейнічае арганізаваная злачынная група. Прыняты самыя актыўныя меры па раскрыцці гэтых злачынстваў. Заведзена адпаведная крымінальна-працэсуальная справа, комплекс мерапрыемстваў, што праводзяцца, узяты мною пад асабісты кантроль”.*

Аляксандр МАЛІНОЎСКІ.

Осужден гендиректор «Мозырьдрева»

Шесть лет в исправительной колонии усиленного режима проведет генеральный директор ОАО “Мозырьдрев” Валерий Стрельцов. Суд признал его вину в злоупотреблении властью и служебными полномочиями, получении взятки и хищении и назначил наказание в виде лишения свободы с конфискацией имущества и лишением права занимать руководящие должности сроком на три года.

Как сообщает Управление КГБ Республики Беларусь по Гомельской области, уголовное дело в отношении генерального директора было возбуждено в конце 2004 года. Руководитель, вопреки интересам предприятия, якобы заключил несколько договоров на поставку в ОАО нефтепродуктов коммерческими структурами, а также отгрузку им в счет оплаты ликвидной продукции предприятия — древесно-стружечной плиты по заниженной отпускной цене. В результате, как посчитал суд, ОАО “Мозырьдрев” был причинен крупный ущерб в виде упущенной выгоды на сумму более 29,4 миллиона рублей, которые по решению суда надлежит взыскать с виновного. За “услуги” директор якобы получил от руководителя одной из коммерческих структур взятку в размере тысячи долларов США.

Ирина МАЛЬЦЕВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 МАЯ 2007 г.

РЕЗОНАНС

«Мы возмущены»

Мы, Цыганков Игорь Иванович и Цыганкова Ольга Петровна, прочитав в газете "Народная воля" от 17.05.2007 г. статью "Без суда і следства" не можем остаться равнодушными.

8 мая 2007 г. гражданину Республики Польша Лукасику Ярославу Генриховичу Отделом внутренних дел Мядельского райисполкома было аннулировано разрешение на постоянное проживание в Республике Беларусь, а также предписано в месячный срок покинуть территорию нашей страны. Причиной такого решения якобы является *"деятельность, направленная на причинение вреда национальной безопасности Республики Беларусь в сфере межконфессиональных отношений"*.

Мы знаем Ярослава Лукасика как человека высоких моральных качеств, он является носителем христианских ценностей и ведет просветительскую работу в сфере истории и культуры. Ярослав и его жена, гражданка Республики Беларусь Лукасик Наталья Михайловна, имеют троих детей — тоже граждан Беларуси. Так по какому праву власти решили разбить семью?

Мы не понимаем, на каком основании органы внутренних дел пришли к выводам, сформулированным в предписании. Мы полагаем, что в нашей стране продолжает действовать презумпция невиновности и без решения суда обвинения, выдвинутые в адрес Ярослава Лукасика, являются безосновательными. А потому считаем недопустимым решение судьбы человека и многодетной семьи на основании голословных обвинений. И мы особенно обеспокоены тем, что подобные ситуации в последнее время приобретают систематический характер.

Согласно Концепции национальной безопасности Республики Беларусь, *"под угрозой национальной безопасности понимаются действия, явления и процессы (или их совокупность), препятствующие реализации жизненно важных интересов личности, общества и государства"*. Более того, согласно части 7 Концепции национальной безопасности, жизненно важными интересами Республики Беларусь в гуманитарной сфере является в том числе и *"обеспечение реализации прав граждан на свободу совести и вероисповедания"*.

Получается, что Ярослав Лукасик как хороший семьянин и христианский верующий содействует реализации жизненно важных интересов нашей страны. А вот действия представителей государственных органов, приведшие к аннулированию разрешения Ярославу Лукасику на пребывание в Республике Беларусь, представляют угрозу национальной безопасности, так как разбивают семью, нарушают права граждан на свободу совести и вероисповедания.

Мы возмущены действиями мядельских властей, мы протестуем против этого и требуем оставить в покое Ярослава и его семью.

"И суд отступил назад, и правда стала вдали, ибо истина преткнулась на площади и честность не может войти" (Книга Пророка Исаии, гл.59, ст.14).

Семья Цыганковых, г.Минск.



Такое письмо Ян Лукасик написал Александру Лукашенко.

КСТАТИ

29 священнослужителей, среди которых епископ Объединения христиан веры евангельской в г.Минске и Минской области Сергей Цвор и епископ Объединения общин христиан полного Евангелия в Республике Беларусь Вячеслав Гончаренко, направили обращение в Департамент по гражданству и миграции МВД Республики Беларусь и в Администрацию президента Республики Беларусь с просьбой отменить решение об аннулировании разрешения Ярославу Лукасику на постоянное проживание в Беларуси. Они также выразили свою обеспокоенность тем, что подобные ситуации в отношении иностранных служителей в последнее время приобретают систематический характер.

ТАК ДУМАЮ

«Без акрэсленай грамадзянскай пазіцыі ты як клоп на падушцы...»

Уважліва назіраючы за падзеямі, якія разгортваліся вакол вядомай гісторыі цкавання майго аднакурсніка **Паўла Харланчука**, хачу падзяліцца некаторымі думкамі аб агульнай сітуацыі, звязанай з адаптацыяй творчай моладзі ў сучасным беларускім грамадстве.

Зразумела, у сённяшніх умовах любога чалавека, незалежна ад прафесіі, можна назваць "палітычна нядобранадзейным" і "шкодным дзяржаве", калі ён мае грмадзянскую пазіцыю, адрозную ад "генеральнай лініі". Але справа ў тым, што толькі адна гісторыя, звязаная з ганеннямі прадстаўніка тэатральнай культуры, набыла такі вялікі грамадскі рэзананс. За кадрам жа застаюцца тысячы такіх ціхмяных распраў над іншадумцамі ў нашым нібыта добраўпарадкаваным тэатральным і кінаасяроддзі. Кляймо *"вы займаецеся палітыкай, а не стварэннем вечных мастацкіх каштоўнасцяў"* цяпер вешаецца без асаблівых цяжкасцяў, як і абвінавачанне ў прафнепрыгоднасці. Як правіла, хлопчыкамі для біцця робяцца менавіта маладыя і прынцыповыя людзі, якім агідная двурушнасць, а патрэбна праўда.

Цікава, пра якія ж гэта "вечныя каштоўнасці" казаў беднаму Паўлу наш дарагі педагог **Барыс Іванавіч Луцэнка**, сцвярджаючы, што *"мастацтва — вечна"*? Хочацца верыць, што не пра адкрытае хамства, подлы цынізм, падвоеную мараль, чорную зайздрасць да калегі альбо баязлівасць, што калісьці прыйдзецца саступіць сваё месца камусьці іншаму, таму лепей адразу прыдушыць дзіця ў калысцы, пакуль яно не ператварылася ў магутнага волата. Зрэшты, гэтыя "вечныя каштоўнасці" ўвесь час суправаджаюць мастацтва, у прыватнасці — беларускае... Заўважце, на сцэнах дзяржаўных тэатраў амаль не бачна пастановак маладых рэжысёраў. І не таму, што маладыя рэжысёры не існуюць як клас альбо прынцыпова не жадаюць ставіць на дзяржаўных падмостках, а зусім па іншых прычынах...

Варта зірнуць хоць бы на тое, што творыцца ў кузні нацыянальнай творчай эліты — Беларускай акадэміі мастацтваў, дзе адбываецца зноў жа ціхмянае падаўленне ўсяго іншадумнага і нацыянальнага, моладзь заганяюць у БРСМ, а некаторыя таленавітыя выкладчыкі пазбаўляюцца працы. На першы план выходзіць ідэалогія, а не мастацтва...

Безумоўна, Акадэмія мастацтваў — гэта лакмусавая паперка ўсяго беларускага тэатральнага і выяўленчага мастацтва, і працэсы, якія адбываюцца там, непазбежна паўстануць і ў культурным працэсе краіны. І ў дадзеным выпадку адкрытая грамадская пазіцыя таго ж Харланчука проста не супадае з існуючай у дзяржаве афіцыйнай ідэалогіяй. Толькі не магу высветліць — прычым ягоны здаровы патрыятызм да нейкай палітычнай дзейнасці?! Ніколі не бачыў Харланчука з аўтаматам, у асноўным — з томікам паэзіі...

Канечне, калі б Харланчук уступіў у БРСМ і трымаў тады на Плошчы не хрыстовы, а чырвона-зялёны сцяг дый яшчэ цытаваў перадавіцы афіцыйных газет, то ён, безумоўна, быў бы лепшым пажаданцам на сцэне для Р.Янкоўскага, найлюбым вучнем Б.Луцэнкі, ідэальным супрацоўнікам для дырэктара тэатра.

Тое судзілішча, якое ўчынілі гордаму і сумленнаму мастаку, зразумела, не робіць гонару адміністрацыі Горкаўскага тэатра, хаця і не здзіўляе... У тэатры бачылі і не такі тэатр! Але сумна, што ў гэтым вертэпе браў удзел **А.Душачкін,** чалавек, якога Горкаўскі лічыў акцёрскім сумленнем. Цікава, што б яму сказала на тыя "гарэзіі" ягоная маці, светлай памяці шаноўная спадарыня Клімава?..

На маю думку, мудрэй за ўсіх паступіў прадстаўнік міністэрства — ён проста прамаўчаў. Нездарма кажуць, маўчанне — золата. Але ясна, што надалей абаяльнае маўчанне шаноўнага Міністэрства культуры пагубна скажацца на здароўі ўсёй нацыянальнай культуры. Бо і гэты канфлікт не вычарпаны, а толькі падліў алею ў вогнішча шматгадовых праблем беларускага тэатра.

Думаецца, што працэс над П.Харланчуком зрабілі паказальным невыпадкова, — найперш, "чтоб другим неповадно было". Гэта ўсяго адзін эпізод. Але, як вядома, пасля мінулагодняй вясны ад звальненняў і дысцыплінарных пакаранняў пацярпелі многія з тых, хто працуе ў тэатральнай сферы краіны. Гэтая метода "па ўтайманванні няўгодных" не новая і даўно мае адпрацаваны механізм...

І яшчэ адно. Нельга не пагадзіцца з Барысам Луцэнкам, што *"палітыка — надзённае, а мастацтва — вечнае"*. Хочацца толькі дадаць, што мастацтва, у адрозненне ад палітыкі, ***заўсёды*** патрабуе чыстых рук і сумлення, таму і вымагае ад творцы акрэсленай грамадзянскай пазіцыі, бо без яе, як любіў паўтараць наш славуты педагог, *"ты як клоп на падушцы"!..*

Сяргей ПАТАРАНСКІ.

ЗДАРЭННЕ

Паранены міліцыянер

У Драгічыне пры затрыманні хуліганаў былі параненыя два чалавекі, адзін з якіх міліцыянер.

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры Драгічынскага раёна, у 21.50 у аператыўнадзяжурную часць Драгічынскага РАУС звярнуўся 34-гадовы жыхар райцэнтра. Ён расказаў, што каля 21.40 на вуліцы Меліярацыйнай яго беспрычынна збілі шасцёра наглядна знаёмых. На месца здарэння выехала аператыўная група Драгічынскага РАУС і пацярпелы, які хацеў паказаць хуліганаў. Пры затрыманні яны аказалі супраціўленне. Адзін з іх (21-гадовы непрацуючы жыхар Драгічына) нанёс нажом малодшаму ўчастковаму інспектару Драгічынскага РАУС пяць колата-рэзаных ран і адно пранікаючае раненне левай часткі грудной клеткі з пашкоджаннем унутраных органаў, а таксама нажавое раненне мужчыне, раней збітаму хуліганамі.

31-гадовы супрацоўнік міліцыі быў дастаўлены ў хірургічнае аддзяленне раённай бальніцы. Другі пацярпелы з пашкоджаннем унутраных органаў — у рэанімацыйнае аддзяленне гэтай жа лячэбнай установы. Яму ўжо зроблена аперацыя. На сёння стан абодвух пацыентаў медыкі ацэньваюць як сярэдняй цяжкасці.

Пракуратурай Драгічынскага раёна ў дачыненні да злачынца распачата справа па ч.2 арт.363 Крымінальнага кодэкса (супраціўленне работніку міліцыі або іншай асобе, якая ахоўвае грамадскі парадак). Ён змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Затрыманы і астатнія асобы, якія ўчынілі хуліганскія дзеянні. Сярод іх двое 1986 года нараджэння, двое 1987 года нараджэння і адзін 1988 года нараджэння. Усе жыхары Драгічына. У дачыненні да іх следчым аддзяленнем распачата справа па ч.2 арт.339 Крымінальнага кодэкса (хуліганства).

Ларыса ШЫГАНАВА.

КРЫМІНАЛ

Маньяка будуць судзіць

Каля чатырох месяцаў доўжылася ў Віцебску следства па гучнай справе аб дзёрзкіх згвалтаваннях школьніц і юных дзяўчат. У суд перададзена справа ў дзесяці тамах, складзеная следчымі абласной пракуратуры.

Цэнтральны персанаж справы — мажны мужчына сярэдніх гадоў, раней ужо судзімы за рабаўніцкія напады на жанчын. У перыяд з лістапада па студзень 2007 года ён учыніў 11 злачынстваў, у тым ліку — тры згвалтаванні і адну спробу згвалтавання.

Злачынца дзейнічаў заўсёды ў нецвярозым стане, хаваў твар, нацягваючы на галаву жаночую панчоху. Усе ахвяры гвалтаўніка — непаўнагадовыя або зусім юныя дзяўчаты, якія не дасягнулі 20-гадовага ўзросту. Маньяк выбіраў ахвярамі яшчэ і такіх, якія з-за фізічнай слабасці не маглі аказаць яму супраціву.

Чуткі пра чарговага сексуальнага маньяка распаўсюдзіліся па Віцебску пасля таго, як ахвярай гвалтаўніка стала дзевяцікласніца. Маньяк накінуўся на яе непадалёку ад школы. Неўзабаве вылюдак паспрабаваў згвалтаваць яшчэ адну 15-гадовую дзяўчынку, але яе адчайны супраціў і прыдушаныя крыкі звярнулі на сябе ўвагу жыльцоў прыватнага сектару, якія выклікалі міліцыю, ды было ўжо позна: злачынца паспеў збегчы.

Праз які час маньяк аб'явіўся зноў. Пры гэтым ён яшчэ стаў рабаваць сваіх ахвяр, аднімаючы ў іх сумкі, упрыгожванні, мабільныя тэлефоны.

Калі пачвару затрымалі, выявілася, што ён, акрамя шэрагу рабаўніцтваў, за якія быў пакараны зняволеннем, з'яўляецца яшчэ і злосным неплацельшчыкам аліментаў на свайго 10-гадовага сына: запазыка сягае за 2 мільёны рублёў.

Абвінавачаны прызнаўся ва ўсіх злачынствах, за якія можа атрымаць ад 8 да 15 год пазбаўлення волі.

На змякчэнне прысуду гвалтаўніку разлічваць не варта. Хоць бы ўжо таму, што ў перыяд віцебскіх злачынстваў на ягоным рахунку быў яшчэ непагашаны шасцігадовы тэрмін судовага пакарання за ранейшыя рабаўніцтвы.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПРАБЛЕМА

Такая вось навука

У мінулым годзе ў Беларусі вучоныя ступені былі прысуджаны 622 навукоўцам. Пра гэта паведаміла на пленарным пасяджэнні 10-й рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных "Асновы дзяржаўнага кіравання" начальнік навукова-метадычнага аддзела Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) Беларусі Ганна Рабава.

Камісіяй было прысуджана 44 ступені "доктар навук" і 578 ступеняў "кандыдат навук". Як зазначыла спецыяліст, у мінулыя гады гэтая лічба складала прыблізна 700.

Паводле слоў Ганны Рабавай, за апошнія гады змянілася прапорцыя паміж дактарамі і кандыдатамі навук. *"Калі раней яна складала адзін да пяці, адзін да шасці, а ў некаторых галінах і адзін да трох, дык цяпер на 13 кандыдатаў прыпадае адзін доктар навук"*, — паведаміла прадстаўнік ВАК. На яе думку, гэта звязана са зніжэннем навуковай дзейнасці ў краіне, а таксама са змяненнямі патрабаванняў да навуковых работ.

Традыцыйна ў тройку лідэраў уваходзяць тэхнічныя, медыцынскія і фізіка-матэматычныя навукі. У папярэднія гады чацвёртае месца займалі эканамічныя навукі, сёлета — сельскагаспадарчыя.

З пачатку года вучоным саветам па абароне дысертацый не падтрымана 75 работ. Прэзідыум ВАК прыняў рашэнне аб канчатковым адхіленні 12 з іх.

Ганна Рабава назвала асноўныя памылкі суіскальнікаў, з якімі даводзіцца сутыкацца спецыялістам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. Асаблівую ўвагу яна звярнула на праблему запазычання. *"Я звяртаюся да вас як да маладых вучоных: паберажыце сваё імя і імёны сваіх навуковых кіраўнікоў"*, — сказала Ганна Рабава. На думку спецыяліста, "плагіят вельмі цяжка вычленіць". У сувязі з гэтым ВАК заключыла дагавор з Расіяй на карыстанне яе праграмай "Антыплагіят".

Наталля КАРОТКАЯ.

ДЕЛА ЖИТЕЙСКИЕ

Вода густо пахла дустом...

Прошлым летом я практически не принимал ванну. Причина была до банальности проста. Горячая вода подозрительно пахла... дустом. Такого раньше не наблюдалось.

Звонки в "Водоканал" ничего не дали. Там отвечали: вы не первый, разбираемся. И тогда я пошел к своему знакомому. Он ученый, занимается водными проблемами. Он высказал такое предположение: коль вода идет из Вилейско-Минского канала, то есть из открытого источника, то, возможно, запах спровоцировали водоросли. Лето горячее, оно способствовало их размножению, и остатки погибших растений, обработанные хлором, скорее всего и дали такой запах.

— А опасна ли такая вода? — спросил я.

— Конечно, — "успокоил" меня ученый.

И я успокоился. Тем более прошло лето, исчез запах. И я смог спокойно забраться в ванну, понежиться в ней. А после этого забываются все проблемы.

Однако не за горами лето. Синоптики снова обещают, что оно будет горячим. Значит, опять появится зловонная вода с запахом дуста, вода, опасная для питья и для принятия душа? Если это случится, страдать буду не только я, а более тридцати процентов жителей столицы. И надо уже теперь бить в колокола, привлечь внимание всех служб, ответственных за качество минской воды. Ведь она сегодня социально значимый продукт. Качество ее стоит на первом месте. Должно стоять, по крайней мере.

Так считает специалист по водной проблематике, занимающийся ею уже не первый десяток лет, кандидат медицинских наук, доцент **Михаил СМИРНОВ**. К нему я и отправился за откровением.

— А откровения нет, — сказал мне Михаил Иванович, — все давно исследовано и все давно известно. Если стоит жаркая погода, то происходит бурный рост микроорганизмов в среде зеленых водорослей. Происходит рост и отмирание их. А отмирание сопровождается выбросом в воду большого количества фенолов. Затем, когда воду начинают хлорировать, образуется хлорфенол. Вот он и обеспечивает вам устойчивый запах дуста.

— Я слышал, что это образование считалось раньше безопасным. А сейчас?

— Безопасным его считали лет пятьдесят назад. Но прошло более полувека, и было установлено, что при образовании хлорфенолов неизбежным продуктом является хлороформ, а также появляющиеся при хлорировании воды и другие опасные вещества.

— Михаил Иванович, выходит, жители микрорайонов, которые пользуются водой открытого водозабора, глотали минувшим летом эти опасные вещества?

— Если не пользовались надежными фильтрами. И будут глотать. В газетах писали про цех углевания, который строится. Но он проблему не решит. К тому же это дорогостоящее мероприятие. А что делать надо, не мне объяснять специалистам. И меня умиляет, когда приводят пример прошлого лета, как какое-то космическое откровение. С момента запуска в эксплуатацию Минского поверхностного водозабора эта ситуация повторяется регулярно, если стоит жаркое лето.

Я лично в 1985 году по заданию Минздрава выполнял работу по теме: гигиеническая оценка барьерных функций очистных сооружений поверхностных водозаборов в Беларуси. На то время их имелось четыре: в Минске, Новополоцке, Гомеле и Гродно. Кстати, тогда было, как и в прошлом году, жаркое лето. И мы определили большое количество хлороформа и хлорфенолов. Тогда действовал норматив 60 микрограммов на литр воды. Но водоканалы его никогда не соблюдали. И что сделали: пошли на хитрость, ПДК увеличили. На бумаге проблему сняли. Но от этого хлороформ безобидным не стал.

— Михаил Иванович, вот Вы сказали, что занимались изучением проблем водозаборов. Насколько я знаю, Вилейско-Минский канал сооружался не для снабжения города Минска питьевой водой. Это была важнейшая по тем временам Всесоюзная стройка, и цели преследовались иные. Поговаривали, что воду из системы будут брать, но только для технических нужд, для нужд предприятий. А питьевая вода для новых микрорайонов станет подаваться из двух подземных источников, которые планировали построить.

— Я тоже слышал это и от довольно компетентных людей. И знаю причину, почему сделали все наоборот. Но не будем ворошить прошлое. Тем более поверхностные водозаборы — не редкость, речной водой почти вся Москва снабжается. И жители российской столицы не ропщут. Молчат и минчане, вдыхая запах хлорки.

— Коль Вы заговорили о хлорке, тогда прокомментируйте мне вот эту информацию, которую я взял из официального источника: *"С начала XX века во всем мире хлорирование является основным способом обеззараживания питьевой воды, поскольку снимает концентрацию болезнетворных микроорганизмов до безопасного уровня.*

***Однако этот реагент номер один имеет существенные недостатки, главный из которых — высокая токсичность хлора и хлорсодержащих соединений, образующихся при взаимодействии в воде с органическими веществами. К настоящему времени уже выделено более 300 химических соединений, которые появляются в воде в результате хлорирования. Такие соединения могут спровоцировать ряд болезней, среди которых пневмония, гастрит, болезни печени, мочевого пузыря, прямой кишки, онкологические заболевания. Употребление загрязненной ими водопроводной воды опасно не только при питье, но и при принятии ванн, душа"*.**

— Я знаю эти цифры. О заболеваниях разговор отдельный, а что касается хлора, то он, конечно, не подарок. Надо с ним правильно работать. Вот и все. В Америке, например, 98 процентов воды хлорируется. В Англии тоже не отстают. Но, понимаете, у них если существуют технологии, то они обязательно выполняются. На Западе очень эффективно очищают воду от органики, после этого хлорирование становится безопасным. И хлорируют они не балонным хлором, а продуктами электрохимической активации, полученной из поваренной соли, растворами, где хлор не главное, а вспомогательное средство. Причем в тех же Штатах обеззараживание, то есть хлорирование, не является очисткой воды. Очистку выполняет коагуляция, при которой из нее удаляется до 80 процентов вирусного загрязнения. А у нас коагуляция никогда не считалась достаточно эффективным, самостоятельным этапом, у нас всегда компенсировали ее тем, что обесцвечивали воду гипердозами хлора. Именно гипердозами. К чему это приводит, я вам сейчас расскажу.

По всем отчетам у нас распрекрасная вода. Но если эту воду не пить, то дети станут болеть на 69 процентов меньше. Это не моя выдумка. Такая цифра есть в докладе главного санитарного врача Беларуси за прошлый год, где он рассказывал о переводе детских учреждений на употребление бутилированной воды.

Кстати, вам надо было бы взять интервью у главврача детской инфекционной больницы и поинтересоваться, дети из каких районов Минска являются наиболее частыми пациентами клиники. Я спрашивал. В клинике преобладают дети из Фрунзенского, Московского, Центрального районов. Главврач, проведя этот анализ, сообщила в "Водоканал" и спросила: в чем дело? Ей, конечно, ничего толком не сказали, но она поняла: детям лучше давать бутилированную воду.

— Михаил Иванович, в связи с тем, что Вы сказали, позвольте процитировать еще один документ, мнение специалиста по воде: *"Это не сверхпроблема, которую нельзя решить на уровне города Минска или любого областного центра, не тратя огромные деньги. Просто надо чуть ответственнее подойти к порученному делу. Вода не должна быть разного качества в зависимости от периодов года. Она — продукт питания. И требования к ней должны быть, как к продукту питания. Человек не должен пить воду, содержащую хлор и хлорорганику. В таком случае она должна называться не питьевой, а предназначенной для хозяйственно-бытовых нужд. К сожалению, у нас не так много воды того качества, которую можно назвать питьевой"*.

— Все правильно, но не так просто добиться того, чтобы наша вода стала такой. Нужны большие деньги. Хотя бесплатный яд нам не нужен. Лучше больше заплатить за чистую питьевую воду, чем потом покупать дорогие лекарства, дорогие фильтры и бутилированную воду.

Затевать радикальную перестройку в водоснабжении не надо. Соблюдайте эффективную очистку и обеззараживание воды, безопасную транспортировку ее по наружным и внутридомовым сетям. Все! Но внутридомовые сети у нас настолько запущены, что они способствуют появлению от 60 до 80 процентов микробиологических загрязнений. Чистить и обеззараживать их — прерогатива ЖЭСов. А они эту работу никогда не делают, хотя мы платим им за то, чтобы раз в три-пять лет трубы чистились и промывались. Кстати, исследования показали, что за счет внутридомовой сети качество воды ухудшается многократно. Особенно плоха она во время утреннего водоразбора. От нее многие заболевания.

— Михаил Иванович, болеть никто не хочет. Поэтому давайте уточним. Что делать — Вы уже сказали. А почему не делается и кто виноват, не ответили.

— В моем рассказе чаще всего упоминался "Водоканал". Да, есть к нему претензии. Но больше всего у меня вопросов к санитарным врачам. Законодательная база по питьевому водоснабжению, которая существует сейчас, для Беларуси давно устарела. В нормативных документах много места уделяется тяжелым металлам. Но где они? Мы же не Урал. И санслужба занимается контролем того, чего в нашей питьевой воде практически нет. Ее внимание должно быть сосредоточено на другом. Например, над вирусными загрязнениями, к которым она только подступается. И подступается робко.

Дальше. Мы когда-то гордились, что республика наша — край большой химии. Она такой и осталась. И остались проблемы загрязнения, связанные с химическим синтезом, нефтеоргсинтезом, связанные с работой химических и нефтеперерабатывающих заводов. А вот они как раз и не контролируются.

Или такой вопрос. Возьмите величину остаточного хлора, которой мы сейчас оперируем и которая дает нам запах хлора. Она была установлена ГОСТом еще в 1950 году. Если снизить концентрацию остаточного активного хлора до 0,1—0,05 миллиграмма на литр, то из питьевой воды уйдет этот пренеприятный запах, а обеззараживание останется эффективным. Но санслужбы страхуют себя. И в результате большие дозы хлора содействуют образованию в сети дополнительного количества хлороформа и хлорфенолов. А они — канцерогены. Ученые выяснили это более 25 лет назад.

— И последний вопрос, волнующий меня. Почему наши специалисты не могли выяснить причину зловонного запаха воды прошлым летом? На тревожные звонки жителей столицы отвечали: разберемся. И сегодня, кажется, разбираются, надеясь, что лето не будет жарким. Хотя вы сказали, что эта проблема известна со времен царя Гороха.

Михаил Иванович посмотрел на меня, иронично улыбнулся:

— А вы им позвоните.

И я позвонил руководству Минского водоканала. От личной встречи со мной оно отказалось, хотя в принципе согласилось с доводами Михаила Смирнова. Да, цех углевания кое-какие вопросы снимет. Да, есть проблемы с водой поверхностного водозабора. Но принято решение перевести весь город на потребление воды из подземных источников. Воды много, ее хватит всем. К сожалению, намеченная работа растянется до 2030 года.

Мне подумалось, это не ледовые дворцы строить. Так что надо крепиться, дожить до радостной даты. И только тогда, через 30 лет, я напьюсь вдоволь чистой, родниковой воды, позабыв навсегда запах дуста.

Евгений КАЗЮКИН.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 МАЯ 2007 г.

ПОСТАЦІ

Віртуоз, чараўнік? Ды ён быў бог беларускіх цымбалаў!

Вялікім канцэртам у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі было адзначана 100-годдзе з дня нараджэння народнага артыста Іосіфа Жыновіча

...Даўно тое было, на пачатку 20-х гадоў мінулага веку. Арэшкавіцкі падлетак Юзік Жыновіч са сваімі неразлучнымі цымбаламі спяшаўся на вясковыя вячоркі — там чакалі хлопцы і дзяўчаты. Як раптам яго пераймае незнаёмы чалавек гарадскога выгляду: "Я пра цябе ведаю, хлопча, і пра сям'ю тваю, дзе ўсе здатныя музыкі. Хочаш іграць у Мінску, у сапраўдным тэатры? Тады загортвай свае цымбалы ў посцілку, з бацькамі развітайся — і са мной!"

Цяжка паверыць у такое, але ўжо літаральна праз два дні пятнаццацігадовы самародак, адшуканы на Пухаўшчыне знакамітым рэжысёрам БДТ (пазней — Купалаўскі тэатр) Юрыем Тарычам, хвацка, азартна граў на сцэне ў Купалавай "Паўлінцы"!

Нейкім дзівам дайшоўшая да нашых дзён старая кінастужка схапіла гэты лёсавызначальны для будучага карыфея музыкі момант. І агнявістая танцавальная мелодыя, што віравала ў кадры на ўсталяваным у філарманічнай зале экране, была падхоплена і прадоўжана жывым аркестрам на сцэне, загучала на ўсю моц у выкананні сённяшніх музыкаў, што ідуць па слядах легендарнага чараўніка цымбалаў Іосіфа Жыновіча.

Так: чараўнік, віртуоз, валадар любімага ў народзе музычнага інструмента — як толькі ні называюць гэтага унікальнага, незвычайна адоранага творцу. Прафесар Міхаіл Казінец — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І.Жыновіча — нават ужыў зусім, здавалася б, не музычнае, але надзіва трапнае вызначэнне — "ваяр". Бо вялікі артыст прысвяціў жыццё і натхненне ўзвышэнню некалі просценькага вясковага інструмента да ўзроўню канцэртнага, прафесійнага, вывеў яго з сялянскай хаты на шырокі абсяг. Перасатварыў, удасканаліў, надзяліў такімі ўласцівасцямі, што беларускія цымбалы загучалі ва ўсёй магічнай і шматколернай красе на самых прэстыжных канцэртных пляцоўках мноства краін свету. Іосіф Іосіфавіч нястомна змагаўся за тое, каб цудоўнай музыкай сваёй Радзімы скарыць сэрцы мільёнаў слухачоў, узяць іх у палон ласкавай і магутнай сілай непаўторнага мастацтва. Ён хацеў, каб у срэбным цымбальным перазвоне чуліся спевы нашых дуброў і крыніц, авеяных паэзіяй родных прастораў, чуўся голас беларускай душы. І дасягнуў свайго!

Вядома, што падобны цымбалам інструмент ёсць амаль у ста краінах свету. Беларуская ж цымбальная школа, запачаткаваная і загартаваная Іосіфам Жыновічам, прызнана адной з самых лепшых.

Аглушальны поспех суправаджаў і суправаджае выступленні — ці то ў гарадах і вёсачках Беларусі, ці то ў блізкім і далёкім замежжы — створанага Іосіфам Жыновічам калектыву, які вырас з ансамбля цымбалістаў у Нацыянальны акадэмічны народны аркестр і носіць імя свайго стваральніка. На любых, самых вядомых конкурсах, музычных спаборніцтвах дома і за мяжой у аркестра нязменны поспех і перамога — Гран-пры, першыя прэміі, залатыя медалі, захопленыя водгукі знаўцаў і аматараў музыкі...

З бляскам, натхнёна выступіў аркестр і на ўрачыстасці ў гонар 100-годдзя народнага артыста, яшчэ раз пацвердзіўшы: цымбалы могуць усё! Ім пад сілу перадаць веліч і славу нашай гісторыі, любоў да роднага краю ў "Сказе-быліне аб зямлі беларускай" (сачыненне самога Іосіфа Жыновіча), і нескароны дух продкаў у эпічнай фантазіі "Старажытныя беларускія ваяры" кіраўніка фальклорнай групы аркестра Аляксандра Крамко, і яркія, каларытныя мелодыі далёкай ад нас краіны ў складаным класічным творы, напісаным для сімфанічнага аркестра рускім кампазітарам М.Рымскім-Корсакавым.

А пачыналі канцэрт — і тое быў надзвычай кранальны момант — юныя таленты, якія толькі ўступаюць на сцяжыну мастацтва. Творы вялікага маэстра і іншых творцаў з любасцю выконвалі дзеткі са Светлагорскай школы мастацтваў; за імі — крыху старэйшыя — навучэнцы Маладзечанскага і Мінскага музвучылішчаў. І, нарэшце, студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. А калі ўжо да іх далучыліся і ўдалыя таленты яго гадаванцаў. Ён імі ганарыўся! Памятаю, замірала сэрца, калі над цымбаламі ўзляталі рукі-крылы саліста аркестра Веніяміна Бурковіча. Ці яго сябра і земляка Аляксандра Лявончыка, поплеч з якім стаў выступаць яшчэ маленькім сынок Міша...

У перапынку юбілейнага канцэрта мы разгаварыліся з Аляксандрам Дзмітрыевічам — ужо сівым "аксакалам", але надзіва прыгожым чалавекам, які стаяў у купцы такіх жа прыгожых, адухоўленых сяброў-равеснікаў. З імі яны дзялілі бясконцую нялёгкую працу над вечным удасканаленнем майстэрства, якім так ярка бліснулі і зараз.

— Уявіце: мне, таксама вясковаму музыку, выпала амаль што паўтарыць шлях настаўніка. Ён, як калісьці заўважылі яго, разгледзеў ува мне, падлетку, нейкую іскру. Узяў пад сваё крыло, няньчыўся, вучыў, вёў за руку, як родны бацька. Ён хацеў, каб і мы былі адданыя цымбалам, вялі за сабой новае пакаленне музыкантаў.

Аляксандр Дзмітрыевіч не хавае радасці: школа яго настаўніка жыве, зямля наша проста невычэрпная на таленты. У яго ёсць мара — сыграць цэлы канцэрт з сынамі Алесем і Мішам, які, дарэчы, зараз вучыцца і нязменна паспяхова выступае ў Германіі і іншых краінах Еўропы. Цудоўнай ігрой ён піша, хай і ўдалечыні ад Бацькаўшчыны, сваю *славу Радзіме*, імкнецца радаваць перш за ўсё слухачоў тут, дома...

Але... Неюбілейныя ноткі міжволі ўпляталіся ў святочную партытуру вечарыны ў філармоніі і пры "любаванні" пустымі ложамі для vip-персон. Нават малюпасенькі чыноўнік ад культуры, не кажучы ўжо пра "босаў", не палічыў патрэбным прыйсці на ўрачыстасць, павітаць родных і прыхільнікаў таленту юбіляра з нагоды яго 100-годдзя. Ні тэлеграмы, ні слоўца, ні кветачкі волату нацыянальнага мастацтва ад афіцыйных улад у гонар такой выбітной асобы. Не было і тэлекамер.

Міжволі прыгадалася нядаўняя пышная сустрэча Дзімы Калдуна ў аэрапорце пасля выступу на "Еўрабачанні". Што ж, гэта добра, нават вельмі добра, калі адораны юнак на самым пачатку артыстычнай кар'еры акружаны ўвагай не толькі фанатаў, а і дзяржавы. І дай Бог яму разумна і напоўніцу, дзеля далейшага творчага ўздыму і ўслаўлення сваёй краіны (хацелася, каб і беларускімі песнямі) скарыстаць гэты аванс. Але пры ўсім пры тым параўнанне дзвюх не супаставімых пакуль велічыняў і адносін да іх з боку афіцыйных структур напрошваецца само сабою. Не на карысць гэтых самых структур.

Аднак, можа, яно і лепш, калі не турбуюць сябе прысутнасцю на такіх святах чыноўнікі, што прыйшлі б сюды па нялюбай абавязалаўцы, гаварылі б няшчырыя дзяжурныя словы? Так, у рэшце рэшт, рэльефней відаць, хто ёсць хто і як ставіцца да нацыянальнай культуры.

...А кветак і слоў любові да таго, хто застаўся і доўга будзе ў памяці народнай, на юбілейнай урачыстасці было шмат — ад тых, хто насамрэч любіць і помніць.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

АНОНС

У Мінску ўпершыню пройдзе жаночы рыцарскі турнір

27 мая ў мінскім Лошыцкім парку адбудзецца традыцыйны фестываль сярэднявечнай культуры. На ім упершыню пройдзе жаночы рыцарскі турнір.

Па словах арганізатара фестывалю Арыны Вячоркі, яшчэ адным сюрпрызам стане тое, што рыцары і "рыцаркі" будуць біцца сапраўднымі (сталёвымі) мячамі, а не трэніровачнымі, як гэта было дагэтуль.

Таксама гледачоў чакае старабеларуская кухня, сувеніры і канцэрт гурта "Стары Ольса". Пачатак мерапрыемства ў 12.00, уваход, як і заўсёды, вольны.

СПАДЧЫНА

Чаравалі на ўраджай

Рэдкі для Беларусі абрад "Ваджэнне і пахаванне стралы" правялі жыхары вёскі Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

Абрад мае даўнія індаеўрапейскія карані, але цяпер ён быў прымеркаваны да свята Ушэсця Гасподняга, якое адзначаецца праз 40 дзён пасля Вялікадня. У Казацкія Балсуны паназіраць і паўдзельнічаць у абрадзе прыехалі ўдзельнікі абласнога семінара-практыкума па фальклорнай творчасці, студэнты з Гомеля, госці з Мінска і Літвы.

"У Беларусі толькі ў гэтых мясцінах абрад існуе ў актыўнай форме — гэта значыць праводзіцца самімі мясцовымі жыхарамі, без арганізацыі з боку. "Ваджэнне і пахаванне стралы" тут не спынялася нават у савецкія гады. Абрад сімвалізуе змену вясны і лета. Сваімі дзеяннямі яго ўдзельнікі імкнуцца зберагчы палі ад навальніц і прыцягнуць добры ўраджай", — сказала І.Камарыстава.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

Што такое свабодны радыкал?

У адным з нумароў "Народнай волі" прачытаў заметку "Ежевика спасет от рака?". У ёй гаварылася аб тым, што амерыканскія вучоныя прыйшлі да наступнай высновы — рэчыва, якое ўтрымліваецца ў лясных ягадах, можа ўратаваць ад такой страшнай хваробы, як рак. Вы пішаце, што знойдзена рэчыва, якое можа выратаваць ад негатыўнага ўздзеяння свабодных радыкалаў. Падкажыце, калі ласка, што такое свабодны радыкал?

Леанід Рыжэвіч, Мінская вобласць.

На пытанне спецыяльна для "Народнай волі" адказвае хімік Яўген Гацак.

— Свабодны радыкал — гэта рэакцыйназдольнае злучэнне, прычынай актыўнасці якога з'яўляецца недахоп электронаў у яго складзе. Найвялікшы ўрон арганізму чалавека прыносяць вольныя радыкалы кіслароду. Яны рэагуюць з бялкамі, тлушчамі і іншымі рэчывамі, з якіх складаецца клетка, і прыводзяць да яе заўчаснага старэння і разбурэння. Радыкалы кіслароду ствараюцца ў працэсе гарэння, а таксама за кошт уздзеяння ультрафіялетавага выпраменьвання альбо радыяцыі на паветра.

У той жа час існуюць антыаксіданты — разнастайныя рэчывы (вітаміны, ферменты, флаваноіды), якія выпрацоўваюцца ў клетках раслін і жывёл. Антыаксіданты здольныя звязваць радыкалы ва ўстойлівыя бяспечныя злучэнні. Такія сур'ёзныя захворванні, як атэрасклероз, інсульт, некаторыя формы рака, сардэчна-сасудзістыя захворванні, заўчаснае старэнне і нават банальныя маршчыны — усе яны звязаны з недахопам антыаксідантаў у арганізме. Таму ўжыванне ў ежу садавіны і гародніны, якія з'яўляюцца асноўнымі крыніцамі антыаксідантаў, а таксама прыём адпаведных вітамінаў і біялагічных дабавак зніжае магчымасць узнікнення многіх захворванняў.

Грошы ў Расіі — толькі па картачцы

Падкажыце, калі ласка! Ці магу я, маючы рахунак у ААБ "Беларусбанк", зняць грошы ў Расіі? І калі так, то дзе я магу гэта зрабіць?

Ірына Меляшкевіч, Віцебск.

Выплата грашовых сродкаў па ўкладных рахунках у ААБ "Беларусбанк" здзяйсняецца толькі ў яго ўстановах. Магчымасці атрымаць грашовыя сродкі ў банках Расіі з рахункаў, адкрытых ў ААБ "Беларусбанк", няма.

Для атрымання наяўных грашовых сродкаў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі ААБ "Беларусбанк" прапаноўвае іншую паслугу: атрыманне грошай з дапамогай міжнароднай пластыкавай карткі. Аформіць дакументы і атрымаць яе можна ў любым аддзяленні банка.

Яшчэ раз пра «Еўрабачанне»

Паважаная "Народная воля"! Нядаўна скончыўся чарговы конкурс песні "Еўрабачанне". Калі пра ўдзельнікаў з Беларусі, Украіны і Расіі вядома многае, то пра пераможцу конкурсу — спявачку з Сербіі — інфармацыі не так шмат. Калі ласка, раскажыце пра яе падрабязней.

Людміла Кармільцава, Гродзенская вобласць.

Марыя Шарыфавіч, якая перамагла на "Еўрабачанні-2007" з песняй "Малітва", нарадзілася ў лістападзе 1984 года. Яе маці Верніца Шарыфавіч у свой час была вядомай выканаўцай музыкі ў стылі "этна". Па прызнанні самой пераможцы "Еўрабачання-2007", яна з самага дзяцінства вырашыла прысвяціць сваё жыццё музыцы. Сваю мару дзяўчына распачала ажыццяўляць у 12-гадовым узросце. У школе Марыя не магла цярпець матэматыку, аднак тым не менш зараз навучаецца менеджменту. У вольны ад рэпетыцый і вучобы час Марыя любіць займацца шопінгам — дзяўчына калекцыяніруе духі і мабільныя тэлефоны. Дарэчы, як прызнаецца сама спявачка, яна не ведае дакладна, якая колькасць мабільных тэлефонаў у яе калекцыі на сённяшні дзень.

Маёмасць мужа і жонкі — агульная

Мы з жонкай хочам развесціся. У мяне ёсць аўтамабіль. Грошы на яго пакупку мне падарылі бацькі, але юрыдычна дароўная афармлена не была. Падкажыце, ці будзе лічыцца гэты аўтамабіль агульнай маёмасцю, якая падлягае раздзелу?

Сяргей Шапавалаў, Барысаў.

У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам, маёмасць, якая нажыта мужам і жонкай у перыяд шлюбу, незалежна ад таго, кім з іх яна набыта, з'яўляецца іх агульнай маёмасцю. Муж і жонка маюць на яе роўныя правы. А вось маёмасць, якая належала ім да ўступлення ў шлюб, а таксама была атрымана ў якасці падарунка ці ў спадчыну ў перыяд шлюбу, падзелу не падлягае.

Шматдзетным сем'ям — зялёнае святло

Я стаю ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. У мяне жонка і дзіця. Праз некалькі тыдняў у нас, як кажуць урачы, народзяцца двайняты. Ці магу я разлічваць на хутчэйшае паляпшэнне жыллёвых умоў?

Зміцер Мацюшэнка, Мінск.

Так, на гэта вы разлічваць можаце. Паколькі права на першаснае паляпшэнне жыллёвых умоў маюць шматдзетныя сем'і. І маці, якія маюць званне "Маці-гераіня", жанчыны, якія ўзнагароджаны медалём "Мацярынская слава". Гэта замацавана адпаведным указам прэзідэнта.

Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь...".

Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.



ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Улады вызвалілі Севярынца, Статкевіча. Калі дойдзе чарга да «Народнай волі»?

Шаноўныя чытачы!

Памятаеце, што гаварыў на прэс-канферэнцыі Аляксандр Лукашэнка? Што ён не супраць таго, каб "Народная воля" друкавалася ў Мінску.

Амаль два месяцы прайшло, а зрухаў ніякіх. Вызвалілі з "хіміі" Севярынца, Статкевіча, можа, усё ж вернуць з "эміграцыі" і "Народную волю"?

А пакуль блакаду не знялі, дзейнічаем, шаноўныя сябры, так, як і дзейнічалі: друкуемся ў Смаленску, распаўсюджваем газету ўласнымі сіламі. Хто яшчэ не зрабіў **перадаплату** за чэрвеньскія нумары — калі ласка, зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. З такой просьбай рэдакцыя звяртаецца і да тых, хто запазычыўся, г.зн. у маі атрымліваў газету авансам. Шкада, але, калі Вы не падтрымаеце "Народную волю", нам, паўтараем, давядзецца развітацца.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна нават да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май,	июнь 2007 г.			
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май,	июнь 2007 г.			
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 23.05.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №